Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 239 (5072)
НАСТРЫЧНІКА
24
СЕРАДА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ШЫРЫЦЦА КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ

ЛЁЗНА. (Па тэлеграфу). У сувязі з заняценнем раёна на чырвоную дошку ў вёсцы Гарэлікі, Добрамысляненскага сельсовета, арганізаваўся новы калгас імя Гікало з 27 гаспадарак. У гэтым сельсавеце за апошнія дні ўступіла ў калгасы 56 аднаасобных гаспадарак. У Замшанскім сельсавеце арганізаваўся калгас імя VII з'езда советаў. Завяршаецца суцальная калектывізацыя ў Чэрвеньскім сельсавеце, дзе ў калгасы ўступіла 112 новых гаспадарак.

Мікуцкі, Зарубежны

ОРША. (Па тэлеграфу). Падрыхтоўку да Кастрычніцкай галавіны і з'езда советаў працоўныя аднаасобнікі Аршаншчыны адзначаюць масавым прыліўам у калгасы. У калгас Пятлінеўскага сельсовета за апошнюю дэкаду ўступіла 176 гаспадарак. У калгас «Ясная зара», Какоўчыцкага сельсовета, уступіла 15 гаспадарак. Наглядаецца масавы прыліў і ў калгасы іншых сельсоветаў.

Капектыўны карэспандэнт «Звязды» Рэдакцыя «Ленінскі прызыў»

КРЫЧАЎ. (Па тэлеграфу). За апошнюю дэкаду ў калгасы Чырвонапольскага раёна ўступіла 270 аднаасобных гаспадарак. Арганізаваны тры новыя калгасы: імя VII з'езда советаў у Чарняўскім сельсавеце, імя Гікало, у Мхініцкім сельсавеце, і імя XI з'езда советаў — у Гарадзецкім сельсавеце.

Вішнеўскі

РАПАРТАВАЦЬ З'ЕЗДУ СОВЕТАЎ ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАННЕМ ФІНПЛАНА

Наша краіна актыўна рыхтуецца да перавыбараў советаў — базавых арганізатараў мірнай працы і абароны краіны. Гаспадару вялікай слаўнай радзімы — VII з'езду советаў — працоўныя рыхтуюць рапарт аб сваіх бліскучых перамогах на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Участак фінансавай работы з'яўляецца адным з важнейшых участкаў сацыялістычнага будаўніцтва. Барацьба за ўзорныя паказальнікі на гэтым участку павінна весціся з такім-жа ўздымам і напорыстасцю, як і барацьба за веснавую сяўбу, за ўборку, за пастаўкі хлеба і ільну, за жывёлагадоўлю.

Перадавыя раёны БССР іменна так і падыходзяць да вырашэння гэтай важнейшай задачы. Толькі такая пастаноўка работы і дала магчымасць БССР у трэцім квартале рапартаваць аб перавыкананні плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва і плацяжоў аграмаджанага сектара.

Беларусь у трэцім квартале на гэтым участку работы заняла адно з першых месц у радзе саюзных рэспублік і абласцей.

Аднак, захапляцца перамогамі трэцяга квартала ні ў якім разе нельга. Праўда, квартальны план перавыкананы. Але гэта перавыкананне далёка не ліквідавала недабораў у папярэдніх кварталах.

Больш таго, надзвычай дрэнна якасна выкананы план. За добрымі справаздачнымі рэспубліканскімі лічбамі хаваюцца 19 раёнаў, якія ледзь перавалілі за 50 проц. плана. Нават у такіх буйнейшых раёнах, як **Магілёўскі, Бабруйскі** і інш., і па сённяшні дзень ёсць вялікая няпоўнка па культабору.

Зусім дрэннае выкананне планаў **па паенакапленнях у спажывецкай кааперацыі** амаль ва ўсіх раёнах. Не забяспечана своечасовае і поўнае паступленне абавязковых плацяжоў з аднаасобных гаспадарак, слаба паступаюць узносы на падпісцы калгаснікаў пасля другога года другой пяцігодкі.

Між тым, у работнікаў фінансава-крэдытнай сістэмы БССР, як і ў кіруючых работнікаў раду раёнаў зд поспехаў на фінфронце, як кідаць, закружыліся галовы. Яны захапіўшыся поспехамі трэцяга квартала, рашылі ў пачатку чацвертага адпачыць. Рэзультат гэтага сказаўся вельмі хутка.

Першая дэкада кастрычніка дала рэзкае зніжэнне тэмпаў выканання фінплана. Сярэдняя лічба 7,5 проц. квартальнага задання за дэкаду — гэтаганебнейшае сведчанне аб нікуды не годнай рабоце фінансавых органаў і фінансавых секцый советаў, гэта доказ рыўкоў, кампанейшчыны, штурмаў, упарных пяцідневак і дзесяцідневак, якімі асобныя раёны навёрствяюць у канцы квартала ці месяца ўпушчанае з пачатку квартала або месяца, доказ адсутнасці сістэматычнай масавай работы з фінансавым актывам, з секцыямі советаў.

Як-жа інакш можна вытлумачыць, напрыклад, тое, што **полацкія** раённыя арганізацыі выканалі план мабілізацыі сродкаў насельніцтва за дэкаду ўсяго на 1,2 проц., або Ельскага раёна — на 3,1 проц. Гэтыя ганебныя паказальнікі — рэзультат адсутнасці настойлівай барацьбы за павышэнне якасці фінансавай работы, за паляпшэнні метадаў кіраўніцтва, рэзультат адсутнасці папулярызацыі лепшых форм і метадаў работы перадавых раёнаў, советаў, калгасаў. Між тым, без гэтага нельга выканаць своечасова і добраякасна фінансавы план, нельга падцягнуць адстаючыя ўчасткі работы.

Поспехі па выкананню фінансавага плана Менскам, Слуцкам і іншымі перадавымі раёнамі іменна і тлумачацца тым, што партыйныя і совецкія арганізацыі гэтых раёнаў сур'ёзна сістэматычна займаюцца фінансавымі пытаннямі, расстаноўкай людзей. Яны здолелі па-большэвіцку ўвязаць барацьбу за фінплан з уборкай, хлебаздачай, пасеўнай кампаніяй і інш. Яны сістэматычна, канкрэтна, аперэтыўна кіруюць сельсаветамі, арганізуюць фінансавы актыў, уцягваюць гэты актыў, у непасрэдную канкрэтную работу на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, правяраюць яго работу. На жаль, вельмі мала раёнаў БССР могуць гэтым пахваліцца.

У чацвертым квартале перад фінансавай сістэмай стаяць надзвычай адказныя задачы. Трэба забяспечыць не толькі выкананне квартальных планаў па ўсіх раёнах і сельсоветах у паасобку па кожнаму плацяжу, але і ліквідаваць недаборы папярэдніх кварталаў з тым, каб з поспехам завяршыць гадавы фінансавы план.

Вырашэнню гэтых задач, як нельга лепш, спрыяе шырока разгарнуўшыйся паход імя з'ездаў советаў і падыходзячая справаздачна - перавыбарчая кампанія советаў. Гэтыя масавыя палітычныя мерапрыемствы павінны быць выкарыстаны для выканання фінансавага плана.

Трэба дабіцца таго, каб да перавыбараў кожны калгас, кожны совет, кожны раён, кожны дэпутат совета і кожны выбаршчык прышлі з поўным выкананнем фінансавых абавязацельстваў. Гэта, з **адкага боку. З другога боку, на справаздачна - перавыбарчых сходах задачы фінансавай работы павінны атрымаць шырокае асвятленне. Шырокай большэвіцкай крытыцы павінна быць падвергнута работа фінорганаў, советаў, секцый горсоветаў і асабліва фінансавых секцый і рэвізійных камісій сельсоветаў.**

У часе справаздачна - перавыбарчай кампаніі трэба паставіць пытанне так, каб кожны выбаршчык убачыў, як совет змагаўся за ўмацаванне мясцовага бюджэта, фінансавай дысцыпліны, як ён адносіўся да выдаткавання кожнага рубля, да правядзення фінансава - падатковай палітыкі на вёсцы.

У барацьбе за датэрміновае выкананне фінплана асаблівая ўвага павінна быць звернута на ліквідацыю ўсіх недахопаў, упарадкаванне фінансавай справаздачнасці, умацаванне фінансавай дысцыпліны.

Фінансава - крэдытны апарат, змагаючыся за рапарт з'езду советаў, са справаздачна - перавыбарчай кампаніі павінен выйсці больш моцным і з лепшымі вынікамі, чым ёсць зараз. Рашаючым паказальнікам рапарту з'явіцца поўнае выкананне планаў па ўсіх плацяжах усімі раёнамі і сельсаветамі, суровае захаванне законаў, сур'ёзнае ўпарадкаванне справаздачнасці, суровая ахова і беражлівае выдаткаванне грошай.

Па Саюзу і Совецкай Беларусі

НОВАЕ ДАСЯГНЕННЕ СОВЕЦКАЙ ТЭХНІКІ

ЛЕНІНГРАД, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Рабочыя завода імя Карла Маркса т.т. **Карасін і Семёнаў** зрабілі вузлавую сеткавязальную машыну. Віднейшыя прафесары і спецыялісты прызналі, што гэта машына — новае дасягненне совецкай тэхнікі. Яе якасць лепшая за французскую. Французская машына робіць 8 радоў у мінуту, а машына Карасіна і Семёнава — 100 радоў. Завод пачаў выраб першага рамысловага ўзору машыны.

ЗАГАТОЎЛЕНА 10 МІЛЬЁНАЎ ТОН СІЛАСУ

МАСКВА, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Па 15 кастрычніка калгасы загатовілі на СССР 10.020 тыс. тон сілосу. Плач выкананы на 83,5 проц. У 3-й пяцігодцы кастрычніка выканалі задание калгасы Заходняй вобласці і Украіны. Па-ранейшаму адстаюць Сярэдняя Волга, Варонежская, Іванаўская і Курская вобласці, Паўночны Каўказ, Узбекістан і Туркмэнія.

СОВЕЦКІЯ ЭЛЕКТРАМАГНІТЫ

МАСКВА, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). На заводзе «Дынамо» асвоена вытворчасць грузападзёмных электрамагнітаў, якія шырока прымяняюцца ва ўсёй прамысловасці. Завод ужо выпусціў 38 магнітаў грузападзёмнасцю да 1,3 і 5 тон. Совецкія электрамагніты працуюць не горш заграніччных.

АГУЛЬНАГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ МЕНСКАГА ГОРСПАЖЫЎСАЮЗА

Скончыла сваю работу першая агульна-гарадская канферэнцыя менскага горспажыўсаюза, якая абгаварыла пытанне аб рабоце праўлення ЦРК і далейшых задачах.

На канферэнцыі выступілі намеснік сакратара гаркома партыі тав. **Хадасевіч**, сакратар ЦСПСБ тав. **Герэўкер** і старшыня Белкаапсаюза тав. **Баскін**, якія вызначылі задачы, што стаяць перад новым праўленнем горспажыўсаюза.

Старшынёй праўлення горспажыўсаюза выбран тав. **Крэйнін.**

На канферэнцыі быў заключан дагавор на спаборніцтву паміж гомельскім ЦРК і менскім горспажыўсаюзам на лепшую арганізацыю культурнага гандлю.

Пераломy ў ільнозагатоўках няма!

Яго можна забяспечыць не папяровымі заклінаннямі, а канкрэтным, аператыўным кіраўніцтвам, у першую чаргу рашучым правядзеннем у жыццё: 1) закона ўрада аб наличэнні двух працадзён за выкананне дзённай нормы па апрацоўцы ільну, 2) дырэктыў КЦ КП(б)Б і СНК БССР аб рэгулярнай выдачы хлебнага авансу калгаснікам, працуючым на ільне

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР пакінуць за АРШАНСКІМ раёнам, папярэдзіўшы кіраўніцтва раёна, што калі ў наступную пяцідневку не будзе пераломy ў мясапастаўках, раён будзе пазбаўлен пераходнага сцяга. Адзначыць таксама, што раён дагэтуль яшчэ не выканаў задання па хлебазакупках.

Кандыдатам на атрыманне сцяга пакінуць МЕНСКІ раён, указаўшы раённаму кіраўніцтву на неабходнасць узмацнення тэмпаў мясапаставак.

Дадаткова занесці кандыдатам на атрыманне сцяга ПРАПОЙСКІ раён, які выканаў задание па хлебазакупках і паспяхова вядзе ільнозагатоўкі.

Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР па ільнаводчай зоне пакінуць за СЕННЕНСКІМ раёнам.

Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць ЛЁЗНЕНСКІ і ДРЫСЕНСКІ раёны. Папярэдзіць кіраўніцтва Лёзненскага і Дрысенскага раёнаў аб неабходнасці забеспячэння рашучага пераломy ва ўздыме зяблёва. Адзначыць рэзкае зніжэнне тэмпаў і якасці здаваемага валакна па Дрысенскаму раёну і папярэдзіць кіраўніцтва раёна, што калі яно не дабіцца рашучага зруху ў якасці здаваемага валакна і тэмпах загатовак, раён будзе знят з чырвонай дошкі.

АСВЕЙСКІ раён, які з пяцідневкі ў пяцідневку паніжае якасць здаваемага валакна, зняць з кандыдатаў на атрыманне сцяга.

Камісія адначасова адзначае зніжэнне якасці здаваемага валакна па большасці раёнаў (у асаблівасці па БЯЛЫНІЦКАМУ, МСЦІСЛАЎСКАМУ і РАСОНСКАМУ раёнах), што з'яўляецца рэзультатам нядбайных адносін раённых арганізацый да пытанняў якасці.

Улічваючы, што ў выкананні планаў пераапрацоўкі і загатовак ільнопрадукцыі ў Бялынічкім раёне пераломy яшчэ няма, пакінуць раён на чорнай дошцы. За недапушчальнае адставанне ў выкананні планаў ільнозагатовак і заданняў па хлебазакупках пакінуць на чорнай дошцы ПЕТРЫКОЎСКІ і НАРАЎЛЯНСКІ раёны.

Камісія адзначае, што СТАРАДАРОЖСКІ і ГЛУСКІ раёны па тэмпах пераапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі могуць быць зняты з чорнай дошкі, але, прымаючы пад увагу зрыў работы па хлебазакупках, пакінуць раёны на чорнай дошцы.

За ўзмацненне тэмпаў здачы ільнопрадукцыі зняць з чорнай дошкі АСІПАВІЦКІ і ЖЫТКАВІЦКІ раёны. Разам з тым камісія папярэджае кіраўніцтва гэтых раёнаў аб неабходнасці далейшага ўзмацнення тэмпаў пераапрацоўкі ільнавалакна і паставак бульбы дзяржаве. Кіраўніцтву Жыткавіцкага раёна ўказаць на недапушчальнасць далейшага зацягвання ўборкі бульбы.

Дадаткова занесці на чорную дошку ДУБРОВЕНСКІ раён за зрыў ільнозагатовак, недапушчальнае адставанне па пад'ёму зяблёва, мясапастаўках і загатоўцы бульбы; ГОМЕЛЬСКІ раён, які ганебна зрывае план ільнозагатовак (75-е месца) і адстае па мясапастаўках, пад'ёму зяблёва, і КАМАРЫНСКІ раён за зрыў пераапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі, пад'ём зяблёва і хлебазакупак.

Кандыдатамі на чорную дошку пакінуць ЕЛЬСКІ, ЛОЕЎСКІ, РЭЧЫЦКІ і ЧЭРВЕНЬСКІ раёны, у другі раз папярэдзіўшы кіраўніцтва гэтых раёнаў, што калі ў бліжэйшую пяцідневку яны не дабіюцца рашаючага зруху ў пераапрацоўцы і здачы ільнопрадукцыі, яны будуць занесены на чорную дошку.

Чырвоная дошка

Пастановай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносяцца на чырвоную дошку:

АРШАНСКІ раён (сакратар РК **Соскін**, старшыня РВК **Міцькоў**);

МЕНСКІ раён (сакратар ГК **Рыскін**, старшыня оргкамісіі РВК **Турэцкі**);

СЕННЕНСКІ раён (сакратар РК **Кац**, старшыня РВК **Качук**);

ДРЫСЕНСКІ раён (сакратар РК **Бурачэўскі**, старшыня РВК **Антонаў**);

ЛЁЗНЕНСКІ раён (сакратар РК **Дзеніскевіч**, старшыня РВК **Шульга**);

ПРАПОЙСКІ раён (сакратар РК **Казалёў**, старшыня РВК **Чорнабродаў**).

Чорная дошка

За зрыў выканання планаў пераапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі і іншых паставак дзяржаве камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносіць на чорную дошку:

БЯЛЫНІЦКІ раён (сакратар РК **Рымша**, старшыня РВК **Сукала**);

ПЕТРЫКОЎСКІ раён (сакратар РК **Арашчук**, старшыня РВК **Град**);

НАРАЎЛЯНСКІ раён (сакратар РК **Казачонак**, старшыня РВК **Элькін**);

СТАРАДАРОЖСКІ раён (сакратар РК **Шалапёнак**, старшыня РВК **Асташонак**);

ГЛУСКІ раён (сакратар РК **Кузняцоў**, старшыня РВК **Фейгін**);

ДУБРОВЕНСКІ раён (сакратар РК **Мышалаў**, старшыня РВК **Мацько**);

ГОМЕЛЬСКІ раён (сакратар ГК **Шафарэнка**, старшыня горсовета **Малашонак**);

КАМАРЫНСКІ раён (сакратар РК **Трызна**, старшыня РВК **Гузаў**).

„ДОВАДЫ" РАСОНСКАГА ЗАГОТЛЁНА

РАСОНЫ. (Па тэлефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

У **Расонскім** раёне злачынна ігнаруецца дырэктыва ЦК і СНК аб стымуляванні здатчыкаў ільну хлебам і іншымі прадуктамі. На складах Заготільну ляжыць 91 тона хлеба, сотні кілограм цукру, рыбы, прызначаныя для стымулявання ільназдатчыкаў. За ўвесь час Заготлён выдаў калгаснікам 33 цэнтн. хлеба, 27 кгр. цукру, 80 кгр. рыбы. Аднаасобнікам выдана яшчэ менш—25 цэнтнераў хлеба, 35 кгр. рыбы, 5 кгр. цукру.

Выдачу хлеба па меры паступлення ільну Заготлён не практыкуе, спасылаючыся на тое, што, моў, калгасы не жадаюць атрымліваць да поўнага выканання плана. За гэтымі «довадамі» ў сапраўднасці хаваецца няўменне скарыстаць такі магутны вагар загатовак, якім з'яўляецца стымуляванне здатчыкаў прадуктамі. Прадукты ляжаць на складах, псуюцца. Хлеб на складзе Заготільну заражан ужо кляшчом.

У выніку ў большасці калгасаў працуючыя на ільне хлеба не атрымліваюць.

С. ГАЛКІН.

КАЛГАСЫ НЕ АТРЫМЛІВАЮЦЬ ХЛЕБА

ШУМІЛІНА (Па тэлеграфу ад спецыяльных карэспандэнтаў «Звязды»).

Склады Заготільну завалены хлебзам. Атрыман новы нарад на 400 тон. Здатчыкі ільну, за рэдкім выключэннем, хлеб не атрымліваюць. Калгасу «Іскра» належыць атрымаць 1500 пудоў хлеба, але старшыня Белагаловін не забяспечыў яго атрымання. Такі малюнак у калгасах імя Сталіна, «Ленінец», Урыцкага і іншых сельсоветаў. Кіраўнікі калгасаў тлумачаць: «дрэнная дарога, няма грошай; паспеем, няма куды спяшацца». **Раённыя арганізацыі вераць гэтаму.** Здатчыкі ільну звяртаюцца ў калгасы з пустымі фурманкамі.

Гэтыя факты таворацъ аб тым, што ў раёне не пераможаны шкодныя тэндэнцыі, мейшыя месца ў мінулым годзе—зацягваць атрыманне ільнянога хлеба з разлікам размеркаваць яго на агульныя працадні. **У выніку—тэмпы загатовак за апошнюю пяцідзёнку знізіліся ў два разы.**

Мікуцкі ЗАРУБЕЖНЫ.

Тав. ВАЛКОВІЧ У МАГІЛЕВЕ

МАГІЛЕЎ, 23 кастрычніка **(Па тэлефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).**

Сёння ў Магілеў прыбыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Валковіч.**

Тав. Валковіч выступіў з прамовай на нарадзе сакратароў райкомаў, начальнікаў палітаддзелаў, старшынь райкомаў, сакратароў райкомаў комсамола і ўпоўкамэтаў **Мэгілеўскага, Быхаўскага, Шклоўскага і Чавускага** раёнаў.

У сваім выступленні тав. Валковіч указаў, што дасягнутыя поспехі ў выкананні плана хлебапаставак сім-тым з раённых работнікаў ускружылі галаву. У выніку мы пачынаем адставаць па раду асноўных сельскагаспадарчых кампаній.

Далей тав. Валковіч спыняецца на ходзе асноўных сельскагаспадарчых кампаній па раёнах, прадстаўнікі якіх прысутнічаюць на нарадзе.

Уступаючы ў такую грамадска-палітычную кампанію, як перавыбары Советаў, мы павінны разгарнуць шырокую масавую палітычную работу сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, узняць іх рэвалюцыйную пільнасць, каб кустрэць перавыбары советаў поўным завяршэннем асноўных сельскагаспадарчых кампаній, дабіцца далейшага арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацавання калгасаў, дапамагчы працоўным аднаасобнікам стаць на шлях калгаснага заможнага і культурнага жыцця.

ГРЫНГЛАЗ.

ЛЕБЕДЗЕЎ Дмітрый — ударнік калгаса «9 студзеня», Лёзненскага сельсавета, вопытны ільнавод і сушыльшчык ільну. Лебедзеву — 76 год.

Ход загатоўкі ільнопрадукцыі, уздыму зяблёва, загатовак бульбы і мясапаставак па БССР

на 20 кастрычніка 1934 года

№ п. п.	РАЁНЫ	Загатоўлена ільнопрадукцыі ў перавесце на валакно	Загатоўлена ільнавалакна ў проц. па базе	Загатоўлена трасты	Паднята зяблёва	Загатоўлена бульбы	Выкананне плана мясапаставак
1.	Сенненскі	83,3	64,3	100,4	95,3	91,5	75,0
2.	Аршанскі	82,4	80,3	90,2	106,0	94,9	67,9
3.	Асвейскі	69,2	47,1	77,4	74,3	92,0	82,0
4.	Лёзненскі	69,0	44,9	83,1	57,4	80,7	69,0
5.	Дрысенскі	64,0	27,8	66,7	55,4	87,4	85,3
6.	Полацкі	62,0	34,5	84,3	73,1	83,8	72,7
7.	Бешанковіцкі	60,7	39,9	74,5	89,6	95,7	76,9
8.	Сіроцінскі	60,3	71,1	58,2	94,3	84,8	76,3
9.	Менскі	60,3	60,3	—	94,8	98,1	68,6
10.	Чырвонаслабодскі	52,3	52,3	—	96,2	95,5	69,2
11.	Прапойскі	50,6	50,6	—	85,1	83,9	74,2
12.	Расонскі	48,7	5,5	54,8	75,2	86,8	78,4
13.	Касцюковіцкі	45,6	31,6	78,4	87,1	91,8	63,4
14.	Пухавіцкі	42,1	3,5	93,4	86,2	82,3	70,2
15.	Старобінскі	41,2	41,2	—	82,0	84,2	86,7
16.	Бабруйскі	40,8	1,0	93,5	96,5	84,4	71,4
17.	Ушацкі	38,9	8,0	73,7	91,4	86,3	76,7
18.	Шклоўскі	37,4	19,3	57,6	67,2	90,6	73,2
19.	Віцебскі	36,9	36,9	—	85,4	88,4	75,1
20.	Лепельскі	35,1	17,0	44,7	59,0	80,3	71,1
21.	Горацкі	35,0	34,2	36,7	90,8	93,7	80,4
22.	Церахаўскі	34,5	18,2	57,3	68,9	83,4	69,8
23.	Чэрыкаўскі	33,2	33,2	—	93,7	95,1	70,5
24.	Крупскі	32,9	13,2	48,0	84,9	88,4	67,5
25.	Асіпавіцкі	32,7	32,7	—	75,2	89,5	79,8
26.	Крычаўскі	31,3	40,0	18,8	98,2	86,6	69,7
27.	Талачынскі	30,6	23,4	37,1	86,0	82,7	65,9
28.	Суражскі	30,3	37,9	11,1	62,1	84,2	82,8
29.	Любаньскі	29,2	29,2	—	97,7	99,9	89,3
30.	Веткаўскі	28,6	28,6	—	58,5	81,8	81,9
31.	Чашніцкі	28,1	14,6	43,0	86,9	91,9	72,4
32.	Бялыніцкі	27,2	27,2	—	88,2	86,7	69,3
33.	Гарадоцкі	25,5	15,0	37,5	75,1	79,4	73,5
34.	Мсціслаўскі	24,9	4,8	44,4	67,8	89,9	68,1
35.	Бягомльскі	24,6	24,6	—	75,6	88,6	73,7
36.	Уваравіцкі	23,5	3,7	42,2	90,5	89,0	73,2
37.	Буда-Кашалёўск	23,3	23,3	—	87,9	75,7	81,8
38.	Смалявіцкі	23,2	23,2	—	71,6	91,3	63,5
39.	Чавускі	21,7	14,2	29,8	91,3	89,6	67,1
40.	Барысаўскі	21,2	21,2	—	106,1	87,4	66,5
41.	Кармянскі	19,4	2,6	41,6	81,0	84,5	76,8
42.	Чырвонапольскі	18,8	1,1	36,7	78,6	75,3	61,9
43.	Дзяржынскі	18,0	18,0	—	84,2	90,5	68,9
44.	Мазырскі	18,0	18,0	—	78,4	88,9	77,4
45.	Рагачоўскі	17,8	2,7	40,6	78,2	84,4	74,2
46.	Магілеўскі	16,8	7,7	30,9	106,8	85,0	61,4
47.	Капыльскі	16,8	16,8	—	86,6	88,9	76,7
48.	Слуцкі	16,3	16,3	—	104,8	93,6	77,0
49.	Заслаўскі	15,2	15,2	—	102,6	86,6	63,1
50.	Парыцкі	15,0	15,0	—	83,8	84,6	76,8
51.	Тураўскі	14,9	14,9	—	85,1	82,7	80,1
52.	Лагойскі	13,2	13,2	—	105,8	88,3	64,5
53.	Уздзенскі	13,1	13,1	—	98,0	87,7	81,3
54.	Бярэзінскі	12,8	12,8	—	90,5	84,3	75,3
55.	Быхаўскі	12,5	12,5	—	76,9	79,9	73,7
56.	Чачэрскі	12,4	12,4	—	59,4	81,9	78,3
57.	Брагінскі	12,2	12,2	—	71,3	85,0	80,9
58.	Жлобінскі	12,2	12,2	—	72,8	86,8	69,7
59.	Плешчаніцкі	11,4	11,4	—	69,8	88,3	60,5
60.	Жыткавіцкі	11,3	11,3	—	87,2	81,6	80,1
61.	Хойніцкі	10,8	10,8	—	107,5	89,7	71,7
62.	Лельчыцкі	10,6	10,6	—	82,3	73,3	72,9
63.	Старадарожскі	9,6	9,6	—	80,3	86,9	84,4
64.	Глускі	8,4	8,4	—	74,9	90,2	70,6
65.	Клімавіцкі	8,1	8,1	—	93,8	80,8	68,0
66.	Клічаўскі	7,8	7,8	—	84,5	87,2	68,9
67.	Дубровенскі	7,7	7,7	—	68,1	84,9	67,8
68.	Рэчыцкі	7,5	7,5	—	78,0	86,8	69,2
69.	Чэрвеньскі	7,3	7,3	—	91,4	82,4	66,6
70.	Ельскі	5,9	5,9	—	72,0	79,7	79,3
71.	Лоеўскі	5,1	5,1	—	87,8	66,7	76,3
72.	Петрыкоўскі	4,6	4,6	—	99,7	79,4	76,6
73.	Камарынскі	4,0	4,0	—	50,1	91,5	85,1
74.	Нараўлянскі	4,0	4,0	—	50,2	82,9	78,5
75.	Гомельскі	0,6	0,6	—	75,5	88,8	67,7
		37,2	22,0	58,4	83,2	86,6	72,0

РЭДАКТАРАМ ВІЦЕБСКАЙ, АРШАНСКАЙ, БАБРУЙСКАЙ, ПОЛАЦКАЙ, КРУПСКАЙ, ТАЛАЧЫНСКАЙ, ЧАШНІЦКАЙ, ЛЕПЕЛЬСКАЙ, СІРОЦІНСКАЙ, ЛЁЗНЕНСКАЙ, ГАРАДОЦКАЙ І ДРЫСЕНСКАЙ РАЙГАЗЕТ

Надаючы выключна важнае значэнне абвешчанаму рэдакцыямі газет «Звязда», «Большевистский путь» і журналам «Большэвіцкі друк» рэйду па праверцы гатоўнасці транспарту да зімовых перавозак («Звязда» № 236), аддзел культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б прапануе раённым тэрытарыяльным газетам актыўна ўключыцца ў рэйд, забяспечыць масавы ўдзел рабкораў і дабіцца практычных рэзультатаў у справе поўнай падрыхтоўкі ўсіх участкаў транспарта да работы ў зімовы перыяд.

Да пачатку рэйда трэба правесці адпаведную падрыхтоўку: папулярызацыю задач рэйда, арганізацыю рабкораўскіх брыгад, папярэднее азнаямленне з аб'ектамі праверкі і т. д. Прыцягнуць да ўдзелу ў рэйдзе работнікаў заводскіх шматтыражак і рабкораў прадпрыемстваў.

Загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б КОНІК.

ДА ХУІІ ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

„Наша Окцябрская рэволюцыя адкрыла новую эпоху сусветнай гісторыі“ Ленін

МАСАВЫМ ЗАБАСТОВАЧНЫМ РУХАМ, БАРАЦЬБОЙ ЗА УЛАДУ ПАД СЦЯГАМ КОМУНІЗМА АДКАЗАЛІ РАБОЧЫЯ

6 кастрычніка (23 верасня) МАСКВА, Цэнтральны стачачны камітэт чыгуначнікаў абвясціў усерасійскую чыгуначную забастоўку.

Гор. Віцебск. У 12 гадзін пачалася забастоўка чыгуначнікаў Рыга-Орлоўскай чыг.

(«Изв. Витебского Совета» № 106, 1917 г.).

Гор. Менск. С. Р. і С. Д. абгаварыў пытанне аб усерасійскай забастоўцы чыгуначнікаў і пастанавіў падтрымаць патрабаванні чыгуначнікаў.

(«Молот», № 8).

9 кастрычніка ЦК большэвікоў звярнуўся з наступнай адозвай з поваду забастоўкі чыгуначнікаў:

«На дапамогу чыгуначнікам» чыгуначная забастоўка, якая доўга падрыхтоўвалася, разразілася...

...Рабочыя ўсіх галін прамысловасці, свядомыя салдаты і сяляне і ўсе наогул чесныя грамадзяне павінны акружыць чыгуначнікаў атмасферай поўнага спачування, аградзіць іх ад цкавання і правакацыйных атак, контррэволюцыйных банд і дапамагчы ім такім чынам у найкарацейшы тэрмін закончыць павязаную ім забастоўку.

Мы заклікаем усе арганізацыі і ўсіх членаў нашай партыі неадкладна прыкласці ўсе сілы к таму, каб чыгуначнікі не аказаліся ізаляванымі і падаўленымі. Рэволюцыйная салідарнасць працоўных мас — адзінае выратаванне.

Цэнтральны Камітэт РСДРП (большэвікоў). («Рабочий путь»).

12 кастрычніка З поваду гэтай забастоўкі чыгуначнікаў Ленін пісаў:

«Да ліку сімптомаў, маючых не толькі сімптаматычнае, але і вельмі рэальнае значэнне, трэба аднесці яшчэ тое, што маючыя гіганцкае агульнаэканамічнае і агульнапалітычнае і ваеннае значэнне арміі чыгуначнікаў і паштовых служачых прадаўжаюць быць у вострым канфлікце з урадам».

(Ленін, т. XXI, стар. 238).

Канец верасня пачатак кастрычніка МЕНСК. З пабаставалі рабочыя трамвая.

(«Изв. Вит. Совета», № 191).

ВІЦЕБСК. Зрычыны нездавалення патрабаванняў аб павелічэнні заработнай платы забаставалі рабочыя ўсіх друкарань.

(«Печатник», № 4, верасень 1917 г.).

МЕНСК. Забаставалі работніцы і рабочыя швэйных майстэрань Слепян, Браніцкі і Ліберман.

НЕВЕЛЬ. Забаставалі рабочыя краўцы і мадысткі.

10 кастрычніка БАКУ. У 8 гадзін раніцы пачалася агульная забастоўка нафтавых промыслаў.

(Зборнік «Революция 1917 г.», стар. 269).

9 кастрычніка Усерасійская нарада тэкстыльшчыкаў прыняла рэзалюцыю, дзе гаворыцца:

«Эканамічная палітыка рабочага класа прама ўпіраецца ў праблему ўлады. Усерасійская нарада тэкстыльшчыкаў пастанаўляе: весці энергічную барацьбу супроць згоды з буржуазіяй і за пераход улады ў рукі Советаў, бо толькі такая ўлада можа выратаваць краіну ад эканамічнага і палітычнага развалу і палепшыць становішча рабочага класа.

11 кастрычніка На агульным сходзе рабочых Пуцілаўскага завода прымаецца прапанаваная большэвікамі рэзалюцыя: 1) Мы, рабочыя Пуцілаўскага завода, патрабуем перадачы ўсёй улады Советам Рабочых, Салд. і Сялянскіх дэпутатаў...

2) Патрабуем неадкладна перадачу зямель намешчыцкіх, табінецкіх, удзельных і царкоўных зямельным сялянскім камітетам. 3) Патрабуем неадкладнага кантролю над вытворчасцю. 4) Патрабуем неадкладнага з'езда ўсерасійскіх советаў. 5) Патрабуем узбраення ўсяго рэволюцыйнага рабочага класа.

Няхай жыве Совет!

Уся ўлада Совету!

(«Арх. Рев. 1917 г.» стар. 194).

Інстытут гісторыі партыі і Окцябрскай рэволюцыі пры ЦК КП(б)Б.

МІТЫНГ НА ФРОНЦЕ

ЗАКУПКІ ХЛЕБА

ЧЫМ-БЫ ДЗІЦЯ НЕ ЦЕШЫЛАСЯ...

АСІПАВІЧЫ. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

— Нельга сказаць, што ў нас закупкі ідуць вельмі добра. Але ў нас становішча не горшае, чым у Пухавічах,—заяўляе сакратар РК КП(б)Б тав. **Фельдман.**

Раўненне на горшыя раёны адчуваецца ва ўсёй рабоце па хлебазакупках. Раён абавязаўся закупіць 1200 тон, а да 20 кастрычніка закупіў 335.

З самага пачатку не быў дан адпор антыдзяржаўным элементам, нездаровай канкурэнцыі закупшчыкаў.

Упаўнаважаны Заготзярно па Верайцоўскаму сельсовету Галюс перахватваў прадаўцоў, а старшыня сельсавету Грышановіч адмаўляўся прадаваць тавар па квітанцыях Заготзярно.

Рад кіраўнікоў калгасаў сталі на шлях простага сабатажу, хаваючы лішкі хлеба. Старшыня калгаса імя Леніна, Ясенскага сельсовета, **Літвінка** заявіў: «Хлеба няма, прадаваць не буду». Гэты кулацкі агент умудрыўся скласці ашуканчы баланс, паводле якога гектар дае не больш 6 цэнтнераў ураджаю. Пры праверцы аказалася, што ў калгасе ўраджай перавысіў 8 цэнтнераў зернавых з гектара.

Старшыня райвыканкома тав. **Карэленка,** загадчык канторы Заготзярно тав. **Кротаў** старшыня райсаюза **Шпеер** знаходзяць розныя прычыны адставання раёна ў закупках хлеба. Яны апраўдваюць дрэнную работу тым, што «няма цягавай сілы, хварэюць коні».

Гэтай «аб'ектыўнай прычынай» яны тлумачаць рэзкае зніжэнне тэмпаў за апошнюю пяцідзённку. А калі з Магілева перакінулі для перавозкі грузавую машыну, дык яна ўжо цэлую пяцідзённку стаіць без работы.

— Нас не падохаюць цяперашнія лічбы закупак. У нас па дагаварах ужо закуплена 500 тон,—заяўляе тав. Шпеер.

Ён забывае, што закупленым лічыцца толькі той хлеб, які паступіў на склады кааперацыі або Заготзярно. Казыраць хлебам, які лічыцца толькі ў дагаварах, могуць толькі балбатуны, якія імкнуцца ўсякім спосабамі прыкрыць сваю дрэнную работу.

Адна з прычын адставання — незадавальняючае атавраванне хлеба. У сельсавеце вельмі мала гатовай вопраткі, вялікі попыт у раёне на лыкі, але іх няма ні ў адным сельсавеце.

І, нарэшце, у Асіпавічах зусім не купляюць хлеб у аднаасобнікаў. Масава растлумачальная работа сярод іх не праводзіцца.

— Праўда,—заяўляе старшыня РВК тав. Караленка,—тут няма чым хваліцца.

А чым могуць пахваліцца асіпавіцкія кіраўнікі? Тым, што яны эксперуюць хлебам, запісаным у дагаварах? Або тым, што яны раўнаюцца па адстаючых раёнах?

Н. Г.

ШКОДНАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

Гомельскі райспажыўсаюз закупіў у калгасаў і аднаасобнікаў 927 цэнтнераў хлеба. Перадавыя калгасы раёна прадавалі па 10-15 і больш тон. Калгасныя і поадпоўныя аднаасобнікі таксама прадаюць лішкі збожжа дзяржаве.

Адстае сістэма Заготзярно, якая закупіла толькі 16 тон. Гэта сведчыць аб поўнай адсутнасці арганізацыйнай работы.

Перашкаджаюць закупкам безупынныя спрэчкі паміж райспажыўсаюзам і Заготзярно. Ёсць факты, калі калгаснікам на пунктах Заготзярно не выдалі квіткоў таму, што яны адмовіліся залічыць прывезены хлеб у лік закупак канторы.

Райсаюз дрэнна адгружае тавары сельпо. База Белкаапсаюза не выконвае нарадаў на адгрузку тавараў. Мясцовая прамысловасць, база Швейзбыта і Бавоўнаабыта не аказваюць райспажыўсаюзу ніякай дапамогі.

К. ГОЗ.

АЛ. ДУДАР

АСТУРЫЙСКІ МАРШ

Чорнае золата дрэмле ў гарах.
Стройны маіс выспявае ў палях,
У вінніцах тлее іскрысты агонь.
Сонца гарыць... Для каго? Для каго?..

У каменных норах бязлітасных гор
Ў вечнай начы памірае шахцёр,
каб зіхацеў генеральскі мундзір,
каб усміхаўся кажоткам банкір
і каб сыцелі ў манастырах
з гладкай манахіняй чорны манах.
Гэта для іх жывуць каралі,
гэта для іх плывуць караблі,
гэта для іх зіхацяць гарады,
гэта для іх зацвітаюць сады!
А для цябе, шахцёр, над табой
горкае шчасце з кастлявай рукой,
горкае шчасце галодных начэй,
горкае шчасце паблеклых вачэй —
роспач, і жудасць, і смерць без клапот
сёння, і ўчора, і тысячы год.

Болей няма ні цярпення, ні сіл
вечна блукаць па полі магіл!
Пеніцца гневу высокі вал...
Ёсць жа на белым свеце Масква:
там зацвілі маладосці сады,
там расплыліся палярныя льды,
там батракі і шахцёры пайшлі
ў бойку за шчасце людзей на зямлі;
вымелі нечысць з сваіх дзвярэй
ў хвалі бунтоўныя ўсіх марэй,
і перамога іх прыявяла
да яснае долі жывога святла.

Птушка паўстання над светам пяціць.
Птушка паўстання, як жар, зіхаціць.
Досыць нам, досыць долі ліхой!
З каменных нораў на бой, на бой!
Птушка паўстання лунае ў гарах.
У бойцы за шчасце загінуць не страх.
Славы герояў вякам не схаваць,
пакуль стаіць на свеце Масква,
пакуль паміраюць шахцёры ў зямлі,
пакуль па моры плывуць караблі.
Бой за Советы Мірэс вядзе,
над Овіедо займаецца дзень.
Горэ вам, горэ, банкір і манах!
Зброя цяпер у надзейных руках.
Хай генералы вядуць палкі —
зброі не вырваць з рабочай рукі.

Веюць вятры з-за каменных гор.
Руку салдату пацісні, шахцёр,
глянь яму ў вочы проста і шчыра —
гэта твой брат у шэрым мундзіры.
Стане ён поплеч з табой, твой брат,
стрэльбу сваю паверне назад
і не заглушаць ні гімны, ні маршы
ў сэрцы салдата слова «таварыш».
Птушка паўстання шырокім крылом
спыніць напор генеральскіх капон.
Чорнае золата родных гор
будзе належаць табе, шахцёр;
ў панавым полі маіс зацвіце
для яснавокіх тваіх дзяцей.
І ўсміхнецца, нарэшце, вясна
ўсім, хто ніколі вясны не знаў.

Сонцам нягаснучым зяе над светам
слаўны штандар астурыйскіх советаў.

КАРШІНА НОВАЧЭРКАСКАГА ІНСТЫТУА ПАУТОРАНАЯ У ГОМЕЛІ

(Ад гомельскага карэспандэнта «Звязды»)

Пастанова ЦК КП(б)Б аб Новачэркаскім інстытуце адносіцца і да гомельскіх навучальных устаноў.

Узяць **педагагічны інстытут** (дырэктар тав. **Сташэўскі**).

У новапабудаваным інтэрнаце гэтага інстытута няма вады. Студэнты вымушаны ўмывацца ва дварэ ля студні.

Толькі праз два месяцы пасля пачатку заняткаў прыступілі да праводкі электрычнасці, а калі будзе святло ў інтэрнаце—невядома. Дырэкцыя не паклапацілася, каб загадзя падрыхтаваць асвятленне газай. У выніку студэнты пазбаўлены ўсякай магчымасці самастойна працаваць пасля лекцый. Ні чытальні, ні чырвонага кутка для работы няма. Гэта падрывае вучобу.

У сталовай за абедам многія студэнты прастойваюць па 2 гадзіны—нехапае крэслаў, пасуды, недастатковы штат афіцыянтак.

Усё гэта такія рэчы, якія можна лёгка не дапускаць. Але да гэтага часу пытаннямі студэнцкага быту, як і культурнай работай сярод студэнтаў, ні дырэктар, ні партком, ні прафком не займаліся. Гэтыя справы поўнасцю перададзены каменданту, загадчыку гаспадаркай і іншым другарадным работнікам.

Такім-жа бесклапотным, як тав. Сташэўскі, з'яўляецца і дырэктар **машынабудаўнічага** інстытута тав. **Балабанаў.**

У студэнцкім інтэрнаце гэтага інстытута ніколі не бывае гатавай вады. У сталовай інтэрната адпускаюцца сняданні, але сталовая размешчана за кілометр і ад інстытута і ад інтэрната. А між тым, не цяжка было-б арганізаваць падвоз гарачых сняданняў у інтэрнат, каб не прымушаць студэнтаў некалькі гадзін траціць на снеданне.

Якасць абедаў вельмі дрэнная, меню аднастайнае. Кожны дзень на першае капуста, на другое [illegible] або [illegible] з бульбы, амаль без тлушчаў. Бываюць вялікія чаргі.

При асабістым уменшанні і зацікаўленасці дырэкцыі можна было-б значна палепшыць харчаванне студэнтаў. Але дырэктар інстытута тав. Балабанаў нават ні разу не зайшоў у сталоўку.

ПАЛЯШЧУК.

ЯК У СІРОЦІНЕ „РЭАЛІЗУЮЦЬ“ ПАСТАНОВУ ЦК АБ ПАРТВУЧОБЕ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Старшынёй калгаса «Чырвонае Юрава», Лоўшанскага сельсовета, Сіроцінскага раёна, з'яўляецца кандыдат партыі тав. **Шылоў** і брыгадзірам — спачуваючы **Ефім Емельянаў.** Палітычная падрыхтоўка кожнага з іх надзвычай нізкая: яны нават не знаёмы з статутам і праграмай партыі.

Што-ж робіць **Сіроцінскі** райком партыі і палітаддзел МТС, каб узняць палітычны ўзровень членаў сваёй партарганізацыі?

— Адносна партыйнай вучобы нам яшчэ нічога не гаварылі, — заяўляюць таварышы **Шылоў** і **Емельянаў.**

—Ніякіх указанняў наконт партвучобы мы не атрымлівалі ні ад райкома партыі, ні ад палітаддзела, — таксама заяўляе старшыня Сіроцінскага сельсовета, член партыі тав. **Гільштэйн.**

У Сіроцінскім раёне 133 члены партыі, 54 кандыдаты і 24 спачуваючых, і ні адзін з іх не дасць лепшага адказу, чым таварышы Шылоў, Емельянаў або Гільштэйн.

Праўда, нельга сказаць, каб райком гэтым пытаннем не займаўся. Па словах нам. сакратара райкома партыі тав. Зібельта пытанне аб партвучобе павінна было разглядацца на пленуме райкома 25 верасня. Але пленум не адбыўся, і цяпер гэта пытанне будзе пастаўлена на чарговым пленуме, які яшчэ невядома калі адбудзецца. — А пакуль?

Сетка партасветы не ўкамплектавана. Прапагандысты, паводле слоў тав. Зібельта, падабраны з ліку партыйнага актыву. Але яны яшчэ не праінструктаваны праз адсутнасць камісіі (бо камісій яшчэ таксама няма) і не зацвярджаны райкомам партыі і палітаддзелам. Прэпсемінар таксама не створан, і кіраўнік семінара на бюро райкома не зацверджан.

Пры райкоме ёсць партбінет, які па сумяшчэнню кіруе комсамолец тав. **Громаў.** Але ён сам заяўляе, што па свайму палітычнаму ўзроўню працаваць у якасці загадчыка прапагабінета не здолее. Не арганізавана вучоба комуністаў-адзіночак, аб якіх ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове асобна падкрэсліў.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

ЗАВОД „БОЛЬШЭВІК“ РЫХТУЕЦЦА ДА ЗІМЫ

Скурзавод «Большэвік» (Менск) разгарнуў шырокую падрыхтоўку к зіме. Горкі вопыт мінулага года быў улічан трыкутнікам завода.

Рабочыя завода жывуць ва многіх жактах горада. Трыкутнік заключыў 19 дагавораў з жактамі на рамонт 95 кватэр.

Па дагавору жакт № 55 абавязаўся правесці рамонт у кватэрах рабочых завода ім. Запольскага, Сержанавіча, Добралюбава і інш. У кватэры Запольскага трэба было зрабіць поўны рамонт аж-да афарбоўкі падлог і аклейкі сцен. У кватэры Добралюбава зрабіць новы гонтавы дах, перакрыць сарай, перакласці печ і пліту.

Дырэкцыя завода абавязалася дапамагчы з будматэрыяламі, даць вадаправодчыка і песляра.

Сіламі жактаў ужо здрамантаваны 18-20 кватэр, прычым лепш і акуратней за ўсіх рамонт праводзіць жакт № 55 (старшыня Генкін).

Заводскія арганізацыі не пакінулі ў баку тых, што жывуць на прыватных кватэрах. Мабілізавалі рэсурсы завода: дошкі, слуцк, фанеру, бляху і заводскі транспарт, які адвозіць гэты матэрыял на кватэры рабочых. Такім чынам, каля 100 рабочых атрымалі розны будаўнічы матэрыял.

Рабочым раздана 400 шурак дроў. Заводскія арганізацыі заключылі дагавор з торфзаводам на дастаўку 700 тон торфу для рабочых. Ужо раздана 80 тон торфу. Спачатку некаторыя рабочыя сумняваліся, ці можна ў хатній печы скарыстаць гэты від апалу. Але практыка першых дзён паказала, што торфам можна вельмі добра топіць.

Поспех добрай падрыхтоўкі да зімы заключаецца ў тым, што не толькі трыкутнік завода займаўся гэтым пытаннем, але і трыкутнікі цэхаў. Калі брыгада рабкораў і масавага кантролю выявіла непадрыхтаванасць гароднехавалень да зімы, то трыкутнік завода па гэтаму матэрыялу вызначыў канкрэтныя тэрміны і асоб, адказных за гэта. Выпускаліся бюлетэні ходу праверкі. У рэзультаце гароднехавальні па ЗРК і сталовай адрамантаваны. План закваскі гуркоў, памідораў перавыкананы.

На заводзе адкрыта абутковая рамонтная майстэрня. Расцэнкі на рамонт абутку зніжаны на 40 проц.

Завод «Большэвік» з гонарам выконвае абавязацельствы, узятыя калектывам рабочых у гонар XVII з'езда советаў.

З. МІНКІН

На запытках [illegible] першай змены друкарні імя Сталіна. Кіраўнік тав. Шнэерава.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА ГОМЕЛЬСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ ЭКСПЛААТАЦЫІ тав. АСІПОВІЧУ.

КАЛІ-Ж АТРЫМАЕМ АЛІНАФТ

(Пісьмо старшыні калгаса).

10 жніўня я закупіў у Гомельскім сельгасснабе для калгаса «Чырвоны батрак» (Камарынскага раёна) 306 кілограм алінафту для змазкі сельгасмашыны, якую здаў на станцыі тав. Бабушкіну для адпраўкі ў калгас.

Прайшоў доўгі час, але алінафту калгас не атрымаў. Прышлося ўбіраць і сеяць не змазаўшы машыны.

26 верасня я зноў паехаў [illegible] высвятлення прычыны непрысылкі алінафту. Аказваецца, што ён знаходзіцца яшчэ на станцыі.

ШЭЙН.

ДЫРЭКТАРУ БЕЛПРОМБУДТРЭСТА тав. ВАСЕРМАНУ.

У ШКОЛУ УСЯЛІЛІ СЯМ'Ю

(Пісьмо настаўніка)

Пры фабрыцы-кухні арганізавана школа малаграматных з рабочых будаўнікоў, у якой займаецца 25 чалавек.

Школе адведзена памяшканне. Але загадчык інтэрната **Русак** усяліў у яе сям'ю рабочага, і рабочым няма дзе займацца.

Звярталіся да старшыні рабкома тав. **Ляшчынскага,** але мер ніякіх ён не прымае. **ЛУЦЗВІЧ.**

УПОЎНАВАЖАНАМУ НАРКОМСУВЯЗІ тав. ВАЛОДЗЬКА

ГОД ЦЯГАНІНЫ

(Пісьмо рахункавода)

3-га снежня 1933 года калгас «**Барацьбіт**» перавозіў дрот для праводкі тэлефона з Чаавус у Крычаў.

Магілеўскі паштамт сувязі вінен калгасу за перавозку 30 руб. і на працягу года грошай не выплачвае.

Х. ПЯТРОЎ.

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА ПОЛАЦКАЙ МТС тав. БЕРЗІНГУ.

ПЕШАХОДАМ З КАЛГАСА У КАЛГАС

(Пісьмо агранома)

Полацкая МТС не праводзіць у жыццё рашэнняў партыі і ўрада аб стварэнні ўмоў сельскагаспадарчым кадрам. Аграномы працуюць у дрэнных умовах. Іх не забяспечваюць падводамі для пераездаў. У выніку шмат часу ідзе на пераходы з калгаса ў калгас.

Заработная плата выдаецца несвоечасова толькі таму, што агрономаўскі фонд зарплаты скарыстоўваецца на іншыя мэты.

ГУК.

САКРАТАРУ БАБРУЙСКАГА РК КП(б)Б тав. МІЛЛЕРУ

„НІЧОГА НЕ СЕДАЮ, ГРОШАЙ НЯМА“

(Пісьмо служачага)

15 сакавіка Бабруйскі РК ЛКСМ мяне зняў з работы і накіраваў на курсы начальнікаў піонер-лагераў. Скончыўшы курсы, я працаваў на гэтай рабоце ў Бабруйскім раёне.

Але былы кіраўнік РБ ДКО тав. Фальцман за ганебную кампанію мне і другім работнікам не выдаў зарплаты. Ад новага кіраўніка РБ ДКО тав. Славіна атрымліваю адказ: «Нічога не седаю, у мяне грошай няма».

СОРКІН.

САКРАТАРУ КРУПСКАГА РК КП(б)Б тав. МЕСЯНЬКЕВІЧУ.

ПРАДУКТЫ АДПУСКАЮЦЦА ПА ЗАПІСКАХ

(Пісьмо групы рабочых).

Начальнік ОРС Крупскага лесгаса тав. **Палякоў** не цікавіцца рабочым спажываннем. Ён даручыў свае абавязкі намесніку **Мінькову,** які таксама нічога не робіць.

Рабочыя за другі і трэці квартал не атрымалі пайкоў. У крамах не знойдзеш такіх неабходных прадуктаў, як соль.

Лепшыя тавары адпускаюцца па запісках. Дэцэнтралізаваныя закупкі не праводзяцца. Маюцца факты ашуканства і абважвання.

ЕФРЭНЧЫК, ГВАЗДЗЁЎ, ХІТРО, ПІТКЕВІЧ І МАРОЗ.

Напярэдадні перавыбараў совета

ЗАМЕСТ РАБОТЫ—БАЛБАТНЯ

РАСОЧЫ. (Па тэлефону ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Слова ўзяў старшыня Селяшчынскага сельсовета. Правільней, не ўзяў, а вымушан быў узяць, бо сам т. **Мягкі** вельмі не хацеў выступаць: не было аб чым дакладваць пленуму РВК. Але слова **далі,** і тав. Мягкі зрабіў кароткі і «ясны» даклад:

— Мне няма чаго і гаварыць. Вельмі мала, амаль нічога не зрабілі па падрыхтоўцы да перавыбараў советаў.

І сеў. Вельмі мала маглі паведаміць пленуму РВК і выступіўшыя другія два таварышы з Шлітаўскага і Парэцкага сельсоветаў.

Па ўсёй Расоншчыне, за выключэннем асобных сельсоветаў, падрыхтоўка да перавыбараў не стала яшчэ сапраўднай масава-палітычнай кампаніяй. Раённыя арганізацыі і сельсоветы не ўвязваюць справу падрыхтоўкі да перавыбараў з барацьбой за ліквідацыю прарываў па льнозагатоўках, зяблеве, закупках хлеба і іншых гаспадарча - палітычных кампаніях. Між тым, Расоншчына, як адстаючы раён, павінна была ўлічыць, што:

«пры правільнай большэвіцкай арганізацыі перавыбарчай кампаніі советаў яшчэ вышэй узнімецца барацьба за выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній, **Продаж хлеба дзяржаве,** здача ільну, мяса, малака, вывазка дроў, выкананне фінплана і т. д., — усё гэта ўваходзіць, як неабходная частка барацьбы за права заваяваць месца ў чы[illegible] кнізе советаў, за права рапарту з'езду советаў». (З даклада т. **Чарвякова** на сходзе менскага партактыва).

Самаправерка работы сельсоветаў, іх секцый — важнейшая частка падрыхтоўчай работы да перавыбараў. Аднак, нідзе яна яшчэ не пачалася. Сям-там выдзелены самаправерачныя брыгады, але да работы яны яшчэ не прыступілі. У пераважнай-жа большасці сельсоветаў яшчэ нават не выдзелены брыгады. Афіцыяльна да кожнага сельсовета прымацаваны ўпаўнаважаныя на падрыхтоўцы да перавыбараў. Але значная частка іх пакуль сядзіць у раёне і «кіруе» падрыхтоўкай да перавыбараў завочна.

Некаторыя ўпаўнаважаныя (**Гольдман, Васілевіч, Тарасевіч,** і інш.) ні разу яшчэ не былі на сваіх выбарчых участках. А ў сельсавеце тымчасам дапускаюцца скажэнні дырэктыў і інструкцый вышэйшых органаў аб выбарах у советы. Некалькі характарных фактаў.

У Клясіцкім сельсавеце (старшыня **Красоўскі**) у мінулым годзе было 15 выбарчых пунктаў. У гэтым годзе, замест таго, каб наблізіць пункты да выбаршчыкаў, сельсавет рашыў скараціць іх да 10.

Краснаборскі сельсавет (старшыня т. **Пак**) таксама скараціў лік выбарчых пунктаў з 10 да 7. Сакалішчанскі сельсавет (старшыня **Васнеў**) аднёсся несур'ёзна да выяўлення лішэнцаў. Сельсавет засмечан чужымі класава-варожымі элементамі, а ў спісе лішэнцаў, прадстаўленым на зацвярджэнне раённай выбарчай камісіі, лічыцца толькі 3 чал. А некаторыя сельсоветы, наадварот, занадта перастараліся пры пазбаўленні выбарчых правоў.

У Клясіцкім сельсавеце, напрыклад, пазбавілі права голасу трох аднаасобнікаў - сераднякоў **Кляшкову Арыну, Палкіна Карла і Бурачэўскую Марыю.** У графе «па якой прычыне пазбаўлены» стаіць «глуханямыя». На думку кіраўнікоў Клясіцкага сельсавета глуханямыя не маюць права выбіраць у советы. Да больш дзікіх абсурдаў дадумацца цяжка.

У Гарбачэўскім сельсавеце ў спіс лішэнцаў занеслі 16-гадовага хлопца, які так ці інакш не карыстаецца выбарчымі правамі, як няпоўнагадовы.

Усе гэтыя няправільныя рашэнні цяпер скасаваны раённай выбарчай камісіяй, але яны ясна сведчаць аб тым, што сельсоветы нават не прапрацавалі пастанову ЦВК аб выбарах у советы. Што ўжо гаварыць аб давядзенні гэтых пастаноў да мас выбаршчыкаў...

С. ГАЛКІН.

ЛІЧБЫ АБВІНАВАЧВАЮЦЬ

188 ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ ГАДЗІН У ГОД ТРАЦІЦЦА НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА БЕЗ УСЯКАЙ КАРЫСЦІ

Завод імя Варашылава — адзін з буйнейшых заводаў Беларусі. У цэхах гэтага завода вырабляюцца складаныя свідравальныя і такарныя варштаты, багеры, сушыльныя барабаны, брыкетныя прэсы і тарфяна-элеватарныя машыны.

Завод імя Варашылава — перадавы завод у калоне нашых прадпрыемстваў.

Але прыглядзецеся да работы завода. Ён працуе дрэнна. Пры правільнай пастаноўцы тэхналагічнага працэса ён можа амаль падвоіць выпускаемую зараз прадукцыю. Гэта пацвердзіў дзень найвышэйшых паказальнікаў, як быў праведзен 28 верасня.

Але вынікі гэтага дня не былі замацаваны. Завод працуе па-старому.

Указанні тав. Орджанікідзе аб скрытых рэсурсах цяжкай прамысловасці поўнасцю адносяцца і да беларускіх фабрык і заводаў і завода імя Варашылава, у прыватнасці.

Гэтыя ўказанні павінны стаць баявой праграмай далейшай работы варашылаўцаў.

* * *

«...Якімі рэзервамі, яшчэ нескарыстанымі, мы ўладаем і як іх мабілізаваць, прывесці ў рух?

...Мы павінны адкрыта, па-большэвіцку сказаць, што мы далёка яшчэ не здолелі скарыстаць усіх нашых рэсурсаў. Калі-б мы здолелі як належыць мабілізавацца, мы далі-б куды больш, чым даем зараз. А Совецкая краіна мае права ад нас патрабаваць.

...Я ўжо казаў, што мы маем у цяжкай прамысловасці 6 мільёнаў работнікаў. Як мы іх скарыстоўваем? Як мы скарыстоўваем рабочую сілу? Тут, па мойму, прыдзецца адразу згадзіцца з тым, што замест 7 гадзін працуюць 5—5,5 гадзін.

А як у нас скарыстоўваюцца механізмы? Мы ўсе добра ведаем, што кепска.

Што-ж выходзіць? Выходзіць, што рэзервы ў нас вельмі вялікія. Калі-б мы гэтыя рэзервы прывялі ў рух, калі-б мы іх скарысталі як належыць, мы мелі-б яшчэ большы рост прадукцыі, чым той, якога мы ўжо дасягнулі.

Нашы рэзервы велізарныя. Трэба, каб мы ўсе па-большэвіцку змагаліся за мабілізацыю гэтых рэзерваў, за ўвядзенне іх у дзеянне.

Мы павінны павялічыць і колькасць прадукцыі і рашуча павысіць яе якасць. А як недапушчальна вялік у нас брак пры недахвацы матэрыялаў! Здавалася-б, калі не хапае матэрыялаў, трэба стараццa, каб браку было менш. А такой вялікай колькасці браку, як у нас, і па лініі машынабудаўніцтва, і па лініі металургіі нідзе знайсці нельга.

Калі ў нас ёсць рэзервы, калі ёсць рад узораў добрай работы, то што-ж нам перашкаджае?

На гэтэ трэба адкрыта адказаць: перашкаджае наша яшчэ недастатковае ўменне працаваць. Перашкаджае наша неарганізаванасць, нячоткае кіраўніцтва нашэй прамысловасцю, нашымі прадпрыемствамі, нашымі цэхамі, нашымі агрэгатамі.

(З прамовы тав. ОРДЖАНІКІДЗЕ на нарадзе гаспадарнікаў цяжкай прамысловасці 20 верасня 1934 г.).

60 ПРОЦ. ІДЗЕ Ў СТРУЖКУ

Начальнік такарнага цэха завода С. Л. Айзман

У нас увайшло ў сістэму, што ўсе заказы, якія паступаюць на завод, тэхнічным аддзелам без усякай падрыхтоўкі спускаюцца ў цэх.

Я, як начальнік цэха, замест таго, каб займацца лепшай арганізацыяй работы па выкананню як колькасных, так і якасных паказальнікаў атрыманых заказаў, павінен займацца пытаннем міжцэхавага планавання.

Атрымаўшы заказ, я прымушан зварачацца ў другія цэхі і ставіць ім свае тэрміны, каб яны падрыхтавалі тыя ці іншыя шаблоны і прыстасаванні.

Да гэтага часу ні адзін заказ не даваўся цэху з своечасовым забеспячэннем загатоўкай, прыстасаваннем і інструментам. Яркім прыкладам можа служыць заказ на [illegible] для Магілеўскага трубалійнага завода.

Заказ далі нашаму цэху ў пачатку кастрычніка. Калі я пастаў[illegible] стругаць апекі на станок № 1, то выявілася, што гэта немагчыма, бо патрэбна адліць спецыяльныя прыстасаванні ў выглядзе вугольнікаў для замацавання дэталі. Прыйшлося зняць зноў са станка апоку, і чакаць пакуль дадуць нам гэтыя прыстасаванні. А прастой тым часам павялічваецца.

Не раз я ставіў пытанне і даводзіў напорыста, каб устанавілі прыпускі на поўфабрыкат, які паступае ў такарны цэх для апрацоўкі. Але-ж гэтым пытаннем, як відаць няма калі займацца.

Вось характарны факт. Дэталь № 612 — установачныя кольцы к багеру каваліся з такім разлікам, што ў такарным цэху прыходзіцца **60 проц. пускаць у стружку.** Токар Кавалеўскі замест **40 гадзін па норме патрацію 120.** А колькі патрачана даремна **электраэнергіі, колькі дэфіцытнага матэрыялу пашло ў стружку?** Толькі на адных гэтых кольцах завод выплаціў **240** руб. За 8 месяцаў з-за адсутнасці на заводзе чарнажоў загатовак, такарны цэх патраціў больш **5 тыс. лішніх станкагадзін.** Разам з накладнымі выдаткамі выплачана каля **15 тыс. руб. як даплата** за непатрэбную апрацоўку дэталей.

Пытанні прыпускоў, чарнажы к загатоўкам адтрываюць велізарную ролю ў скарыстанні нашых скрытых рэзерваў. Планавы аддзел павінен спускаць заказы цэхам поўнасцю тэхнічна падрыхтаванымі. Для гэтага нам неабходзен добра ўгрунтаваны тэхпромфінплан.

Повар завода імя Варашылава, спазняючыся з абедам загадвае старшаму табельшчыку не даваць гудка «на абед» да яго распаразвіцця. Вельмі часта, такім чынам, абед спазняецца на 15-20 мінут

Рыс. Н. Леушына.

ДЗЕНЬ завода

Раніца. Заводскі гудок прагудзеў другі раз. Ажываюць цэхі машынабудаўнічага завода. Уключаны рубільнікі маторaў. Яны прыводзяць у рух трансмісіі. Набіраюць адпаведную хуткасць такарныя варштаты. Моцна грукаціць цяжкі молат па ласавому жалезу. Скрыгочуць рашпілі, слесары зборачнага падтаняюць дэталі. Пачынаецца рабочы дзень на заводзе...

—Драгун, ты-ж мой рашпіль узяў, —раздаецца крык у слясарнай.

— Хлусіш, братэк. Я гэты рашпіль у інструментальнай дастаў.

— У інструментальнай няма рашпіля, а гэта мой уласны. Глядзі, на ручцы метка ёсць.

Драгуну прышлося вярнуць рашпіль свайму таварышу, а сам пашоў шукаць інструмент. Драгун шукаў 40 мінут.

**

Ля такарных варштатаў завіхаюцца Лебедзеў і Новікаў. Яны заканчваюць абточваць дэталь да свідравальнага варштата № 250. На гэту работу яны патрацілі роўна 20,5 гадзін. Прышоў прыёмшчык, перакідаў 17 дэталей у адну кучу і тры паклаў у другую.

— Брак, браткі мае. Толькі тры штукі і можна скарыстаць, астатнія трэба вон выкінуць.

— Прычым-жа тут мы—гаворыць Лебедзеў і Новікаў,—брак не наш, а ліцейнага цэха.

— А хто вас вінаваціць? Вінават прыёмшчык ліцейнай Жураўскі. Ён прымаў брак ліцця.

Пагаварыў прыёмшчык з такарамі. Цяжка ўздыхнуў. Гэтым справа скончылася.

**

Слясарна-зборачны цэх настойліва патрабуе падачы дэталі № 274. Яна патрэбна для завяршэння зборкі свідравальных 40-міліметравых варштатаў. Над апрацоўкай гэтай дэталі Баравікін і Валатоўскі працуюць 8 гадзін.

— Прымайце, гатова,—заяўляюць яны майстру Міньковічу.

—Добра. Там у слясарным хвалюецца. У іх прастой з-за гэтай дэталі,—гаворыць Міньковіч і бяжыць у слясарны за прыёмшчыкам.

Нядоўга прышлося чакаць яго. Пачынаецца прыёмка. І... 21 дэталь аказваецца з бракам таго-ж ліцейнага цэха. Дэталі ідуць не ў зборку, а назад у вагранку. Бракаробы заробяць яшчэ раз, адліваючы тую-ж дэталь, а такары патрацяць 8 гадзін на абточку ў другі раз.

**

Стрэлка гадзінніка паказвае без двух мінут дванаццаць. Гудок на абед. Пусцеюць цэхі. Напаўняецца заводская сталоўка. 220 рабочых рассаджваюцца за невялічкімі столікамі.

Праз поўтадзіны ў сталоўцы ціха. Ідуць мінуты. Старшы табельшчык **Петрашкевіч** успамінае, што пара канчаць абед. Ён дае гудок са спазненнем на 13 мінут. Па віне Петрашкевіча рабочыя патрацілі звыш 7 рабочых дзён.

**

У ліцейным астывае толькі што адлітае махавае кола вагой каля двух тон. Бракаробы **Коўзель** і **Тачылка**, здаючы сваю работу, хвалююцца. Яны баяцца, каб Жураўскі не заўважыў браку. А Жураўскі не такі ўжо дрэнны чалавек. Яму абы з рук збыць. Вось ён прымае махавік, накіроўвае яго ў такарны цэх. Там яго абточваюць і бракуюць...

**

Рабочы дзень першай змены скончан. У цэхавых канторах ляжаць на лічыльніках, падводзяць вынікі работы за змену. Выткорчая праграма выканана. Кіраўнікам цэхаў больш нічога не патрэбна. Усе мабілізаваны, прарывы няма. А тое, што мы скарыстанні ўнутраных рэзерваў можна выпуск прадукцыі павялічыць у паўтара раза—іх менш за ўсё цікавіць. Кожны цэх жыве сваім уласным жыццём. Ніякай увязкі ў рабоце няма. За стопрацентным выкананнем праграмы на заводзе хаваюцца абуракчыя агідкасці.

Від цэхаў завода імя Варашылава.

РАБОЧЫ ДЗЕНЬ БАРУШАНСКАГА

8 гадзін раніцы. Працаглы гудок прадвяшчаў аб пачатку работы. Слесар **Мордух Барушанскі** заступіў на раніштнюю змену. Атрымаў нарад. У гэты дзень яму трэба прыганяць башмакі да такарнага варштата. Гэта для яго не навіна. За 6 год работы на заводзе ён ні адзін дзесятак башмакоў прыганяў.

Малады слесар адразу пачаў збіраць інструмент і набіваць кернерам пласцінкі. Але не хапае Мордуху інструментаў.

8 гадзін 14 мінут. Барушанскі ідзе ў інструментальную. Нічога не знайшоў.

8 гадзін 18 мінут. Пашоў па суседа пазычаць...

8 гадзін 19 мінут. Слесар зноў за прыгонкай башмакоў.

8 гадзін 41 мінута. Кароткая размова з брыгадзірам.

8 гадзін 44 мінуты. Барушанскі за зборкай.

8 гадзін 46 мінут. Пашоў шукаць у шафе інструмент.

8 гадзін 47 мінут. Слесар па сапраўднаму **прыступае да работы.**

9 гадзін 34 мінуты. Аглядзеўся, не хапае чагосці, пашоў у інструментальную.

9 гадзін 39 мінут. Заводзіць гутарку з рабочымі.

9 гадзін 49 мінут. Мы бачым нашага слесара каля башмакоў. Але ці на доўга?

10 гадзін 8 мінут. Гутарка з майстрам.

10 гадзін 11 мінут. Інструктаж закончыўся. **Барушанскі працуе.**

10 гадзін 20 мінут. Уходзіць за крэйдай.

10 гадзін 22 мінуты. Задаволены сваёй находкай, Мордух **працуе** да самага абеда.

Пасля абеда ён спазніўся на 2 мінуты. Праўда, тут ён ужо не винават. Гэта старшы табельшчык Петрашкевіч пастараўся

Токар БАРУШАНСКІ М.

даць, як звычайна, гудок на 2 мінуты раней тэрміну.

12 гадзін 2 мінуты прыгнаў першы башмак. Пехапае свярла.

12 гадзін 20 мінут. Ідзе да рабочага за свярлом. Свярла не знайшоў.

12 гадзін 22 мінуты. Пашоў у інструментальную прасіць.

12 гадзін 25 мінут. Працуе.

12 гадзін 55 мінут зноў у інструментальную пашоў.

12 гадзін 56 мінут. Дапамагае суседу.

12 гадзін 59 мінут. Ракордная лічба—**51 мінута за прыгонкай.**

13 гадзін 50 мінут. Дапамагае суседу.

13 гадзін 53 мінуты. За работай.

13 гадзін 57 мінут. Пайшоў у інструментальную. Што ён там рабіў—невядома.

14 гадзін 13 мінут. Усхваляваны, ён **прыступае зноў да работы.**

14 гадзін 36 мінут. Размова з рабочым. Трэба-ж яму пагаварыць з чалавекам.

14 гадзін 38 мінут. За работай.

14 гадзін 55 мінут. Кароткая гутарка.

14 гадзін 56 мінут. Працуе.

15 гадзін 6 мінут. Барушанскі заказвае «хуткую» дапамогу суседу.

15 гадзін 9 мінут. За работай.

15 гадзін 25 мінут. Пехапае інструментаў. Пашоў шукаць.

15 гадзін 27 мінут. Знайшоў інструмент, працуе.

15 гадзін 34 мінуты. Уходзіць куды-сці.

15 гадзін 36 мінут. Працуе да самага гудка.

**

І так **слесар 6 разрада Мордух Барушанскі працаваў прадукцыйна за сваю змену 354 мінуты. 66 мінут ён патраціў на хаджэнне і размовы.**

Такіх фатаграфій на заводзе імя Варашылава можна атрымаць амаль кожны дзень у дзесятках экземпляраў.

НОЧ завода

Цёмная асенняя ноч агарнула карпусы завода. Ідзе халодны дождж. А ў цэхах светла, цёпла і ўтульна. Працуе 3-я змена. Галасы людзей губляюцца ў шуме трансмісій і лёгкае малаткоў.

Інструктары Пагоцкі, Радзівіловіч, Карней разышліся па цэхавых канторках і рашылі прыдрамнуць. Малады токар **Мінько** аж дзве гадзіны шукае Пагоцкага. Варштат яго стаіць. Мінько не ведае што рабіць са шпінделем, які залішне расточан.

Шукалі па цэхах Пагоцкага, шукалі Радзівіловіча і Карнея. На варштаце Эвенчыка парваўся прывадны пас. Эвенчык траціць паўтары гадзіны на пошукі шорніка Вягардзінскага і страціўшы надзею знайсці яго, Эвенчык, абапёршыся на варштат, пачаў драмаць.

**

Рабочыя **Гурскі, Дзятко, Каваленка** спяняюць варштаты. Яны шукаюць матэрыялы для работы. Патраціли па 30 мінут кожны. Нарэшце жалеза знойдзена. Прыступаюць да апрацоўкі. Але не клеіцца справа. Жалеза аказалася цвёрдым, і разцы яго не бяруць. Зноў пошукі матэрыяла. Варштаты стаяць.

**

Токару Дзямянцаву далі да варштата прыёмачнай таўшчыні ролікі для суцэльных ланцугоў. Ён павінен зняць з кожнага ролика пяць стружак замест двух. Знімаецца 20 лішніх міліметраў. На апрацоўку аднаго ролика затрачвае траціцца 3 гадзіны.

**

З самага пачатку работы не ладзілася справа ў работага Бялевіча. Падводзіў амерыканскі патрон. Тады ён паклікаў майстра. Майстар паглядзеў, павярнуў патрон і потым пераканаўча сказаў:

— Які ў інструментальную, такі і направяць кулачкі.

Бялевіч адшрубоўвае патрон, нясе яго ў інструментальную. Кулачкі змяняць нядоўга—патрэбна 20 мінут. Але слесару Левіну няма куды спяшацца. Ён пераменьвае кулачкі **пяць з паловай гадзін.** Бялевіч гуляе.

**

У інструментальна-рамонтнай майстэрні працуюць людзі так, як ім даваляе іх сумленне. Работы іх ніхто не прымае. За якасцю зробленых інструментаў ніхто не сочыць. Адламаўся, напрыклад, «пабедзіт» ад разца, токар ідзе яго ў рамонтную. А там чарга. Начальнік рамонтнай **Коўбат** дрэмле за сваім сталом. Рабочыя **Крус і Дзяменцьеў** чакаюць гадзіну, пакуль іх разцы адрамонтуюцца. Потым паўтадзіны працуюць, і «пабедзіт» зноў адлятае.

**

Ля інструментальнай натоўп. Раздаюцца галасы:

— Дай патрон.

— Свярдзел 5 мм. ёсць?

— Давай шабер.

Праз вакенца інструментальнай чуецца халодны адказ загадчыка Шульмана.

— Вам сказана даўно, што ў нас няма свярдзёлак і шабраў. На патроны, рашпілі, ключы кернера далі заяўку, пакуль не атрымалі.

Цэлую змену стаіць 5-6 варштатаў. Магутны такарны варштат № 64 працуе на другарадных дэталях. Адзіны на заводзе рэвальверны варштат нагружан толькі на 40 проц.

**

...На ўсходзе ружавее зара. Начная змена канчае работу. Весела ідуць дадому тыя рабочыя, якія працавалі з поўнай нагрузкай. Сонныя ідуць тыя, якія патрацілі цэлую змену ў пошуках матэрыялаў і інструментаў. Заступае першая змена, пачынаецца новы дзень і старыя непаладзі...

СТАНКІ, БАГЕРЫ, КАМНЕДРАБІЛКІ...

ТАКАРНЫ ЦЭХ

Сярэдняя непрадукцыйная трата часу аднаго рабочага-токара за 7 гадзін работы складае **30 мінут.** За 25 дзён—**750** мінут, або **12,5** гадзіны.

У цэху працуе 171 чалавек. За месяц увесь цэх траціць непрадукцыйна **2137,5** гадзін.

За гэты час цэх можа выпусціць: **28 свідравальных 25-міліметровых варштатаў, або 9 свідравальных 40 міліметровых варштатаў, або 4 такарныя варштаты, або 0,75 багера, або 7 камнедрабілак.**

СЛЯСАРНЫ ЦЭХ

Сярэдняя непрадукцыйная трата часу аднаго рабочага-слесара за 7 гадзін складае **50 мінут.** За 25 дзён — **1,250** мінут, або 21 гадзіну.

У цэху працуюць **124** чалавекі. За месяц увесь цэх траціць непрадукцыйна **2.604** гадзіны.

За гэты час цэх можа выпусціць (сабраць): **51 свідравальны варштат 25 мм., або 8 камнедрабілак, або 7 такарных варштатаў, або 0,75 багера.**

ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ

Сярэдняя непрадукцыйная трата часу аднаго рабочага-ліцейшчыка за 7 гадзін складае **40 мінут.** За 25 дзён 1.000 мінут, або **17 гадзін.**

У цэху працуе **105** чалавек. За месяц увесь цэх траціць непрадукцыйна **1.785** гадзін.

За гэты час цэх можа адліць: **70 свідравальных варштатаў 25 мм., або 33 свідравальныя варштаты 40 мм., або 15 такарных варштатаў, або 15 камнедрабілак.**

КАЦЕЛЬНЫ ЦЭХ

Сярэдняя непрадукцыйная трата часу аднаго рабочага-кацельшчыка за 7 гадзін складае **78 мінут.** За 25 дзён—**1950** мінут, або 32,5 гадзін.

У цэху працуе **137** чалавек. За месяц увесь цэх траціць непрадукцыйна 4.452 гадзіны.

За гэты час кацельны цэх можа выпусціць **1,5 сушыльных барабаны, або 35 камплектаў капёс да камнедрабілак.**

ПА ЗАВОДУ

Сярэдняя непрадукцыйная трата часу аднаго рабочага завода за 7 гадзін складае **50 мінут.** За 25 дзён 21 гадзіну.

На заводзе працуе **750** чалавек. За месяц увесь завод траціць непрадукцыйна 15.750 гадзін.

За гэты час завод можа даць **98 свідравальных варштатаў 25 мм. (100 проц. сваёй праграмы па станкам), або 30 свідравальных варштатаў 40 мм. або 1,25 багера, або 16 камнедрабілак, або 15 такарных станкоў.**

ЗА ВЫШЭЙШЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ

На нарадзе гаспадарнікаў у верасні месяцы па пытанню аб рэзервах цяжкай прамысловасці тав. **Орджанікідзе** сказаў: **«Нашы машынабудаўнічыя заводы (калі узяць усё машынабудаўніцтва) загружаны не больш як на 80 проц., а многія з іх значна менш».** Гэтыя словы наркома поўнасцю пацвярджаюцца на вопыце праведзенага на нашым заводзе 28 верасня дня найвышэйшых паказальнікаў па ўшчыльненню рабочага дня ў такарным і слясарным цэхах. Гэта пытанне было дастаткова прадумана і падрыхтавана як кіруючым персаналам, так і грамадскасцю ўсяго завода.

Быў мабілізаван патрэбны тэхнічны і абслугоўваючы персанал для падрыхтоўкі выдзеленых на гэта 12 варштатаў і 6 слесароў.

Па такарнаму цэху быў распрацаван спецыяльны «падрыхтоўчы лісток», дзе ўказваліся нумар варштата, прозвішча рабочага, неабходны інструмент і прыстасаванне, прозвішча адказнага за падрыхтоўку варштата і падачу загатовак.

Такім чынам пры адпаведнай падрыхтоўцы мы [illegible] прадукцыйнага [illegible] ўсіх 7 гадзін [illegible] даць нам магчымасць [illegible] такарны цэх (асноўны [illegible] так, дзімітуючы вытворчасць, [illegible] нашу працаёмкую прадукцыю) з цяжкага становішча, у якім ён знаходзіцца на працягу раду месяцаў.

Праўда, такарны цэх выконвае нормы, устаноўленыя тэхнічна-нармовачным бюро. Але вопыт 28 верасня паказаў, што гэтыя нормы могуць быць значна перавышаны за кошт павелічэння прадукцыйнасці працы. Чарговая задача нашага завода — замацаваць гэтыя поспехі, якіх мы дабіліся ў дзень найвышэйшых паказальнікаў.

Прастой нашага абсталявання па віне рамонтнага цэха з'ядаюць штомесячна ад **120** да **200** варштата-гадзін. У верасні з-за няюўнага скарыстання магутнасці варштатаў, у такарным цэху страчана **10.191** варштата-гадзін. Яны маглі-б даць нам дадаткова **5 такарных варштатаў, 5 свідравальных 40-міліметравых і 33 свідравальных 25-міліметравых варштатаў.**

Зараз мы ўводзім аднаўленчы [illegible] абсталявання і планава-[illegible] рамонт яго з выраб[illegible] адпаведных запасных частак. Каб палепшыць якасць рамонту, прыёмшчыку рамонтнага цэха прапанавана рабіць адпаведную прыёмку пасля кожнага рамонту.

Ускладзена адказнасць на кантрольныя асобы за своечасовую падачу загатовак, інструмента і прыстасаванняў да варштатаў.

Абмен большай часткі матораў абсталявання за матары меншай магутнасці і ўстаноўка кампенсатара далі магчымасць павялічыць

Тэхнічны дырэктар завода С. А. ВЕЛІЦКІ

каэфіцыент скарыстання энергіі (косінус фі) ад 0,6 да 0,8. Гэта вызваліла завод ад уплаты Эльводу звычайнага штрафу.

Пабудаваныя спецыяльныя шахтныя топкі для торфу даюць магчымасць скарыстаць толькі 75 проц. торфу і 25 проц. дроў ранейшай колькасці.

Мы ўвялі чоткі каляндарны графік па цэхах, які забяспечвае выпуск прадукцыі па плану. Мы ўводзім у дзеянне асвоеную работу па цвёрдых сплавах «победзіт», які дае павышэнне прадукцыйнасці варштатаў да 30 проц.

Але пры правядзенні гэтых мерапрыемстваў мы сустракаемся з труднасцямі, якія залежаць ад нашых снабжэнчых арганізацый (Белдзяржснаб і Стальзбыт). Мы вымушаны паскорыць у сваім інструментальным цэху выраб спецыяльнага ражучага інструмента. Але разам з гэтым мы таксама павінны вырабіць і пармальны ражучы інструмент, якім абавязаны нас забяспечыць і не забяспечваюць гэтыя арганізацыі. Гэта ніжае тэмпы вырабу спецыяльнага ражучага інструмента.

Снабжэнскія арганізацыі павінны забяспечыць завод адпаведных матэрыяламі па неабходных профілях. Але толькі за першае паўгоддзе 1934 г. завод выплаціў па адхіленнях 34.200 руб. — 6,1 проц. з агульнага фонду зарплаты.

Гэтыя адхіленні галоўным чынам звязаны са зменай тэхналагічнага працэса і ператварэннем дэфіцытнага матэрыяла ў стружку ў сувязі з адсутнасцю патрэбных профіляў сартавога і лістовога жалеза.

Калі ў мінулым годзе з-за адсутнасці швелераў № 14 мы іх кляпалі з куткоў, дык у гэтым годзе наадварот — з-за адсутнасці куткоў 70х70 і 75х75 рэжам швелеры № 14 па куткі. Каб вытачыць вал дыяметрам у 65 міліметраў, мы прымушаны пусціць ў вытворчасць (абточку) валы дыяметрам 90 міліметраў. Гэта звязана з лішняй аплатай рабочай сілы і ператварэннем матэрыялаў у стружку.

Мы атрымалі велізарны вопыт з правядзенага дня найвышэйшых паказальнікаў. Гэты вопыт мы павінны ўкараніць не толькі ў такарны, але на ўсе цэхі нашага завода. Для гэтага патрэбны правільна распрацаваны тэхналагічны працэс, адпаведная арганізацыя працы, правільная расстаноўка рабочай сілы.

БЕЛЫ ТЭРОР У ІСПАНІІ

БЕРЛІН, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Паўстаўшы ў Овіедо разам з войскамі генерала Очоа карэспандэнт «Локаль анцэйгер» паведамляе, што ў адным толькі цвары кавалерыйскай казармы было расстрэляна 700 паўстанцаў. У другім месцы 26 гарнякоў, захопленых са зброяй у руках, былі без суда пастаўлены да сцяны і расстрэляны салдатамі марокканскага легіёна.

Карэспандэнт указвае, што паўстанцы ішлі на смерць бясстрашна і «паміралі з праклёнам на вустах».

1-2 верасня ў Токіё адбываліся вялікія паветраныя манеўры з удзелам грамадзянскага насельніцтва сталіцы. Ч... манеўраў была газавая атака на горад.

НА ЗДЫМКУ: афіцэр тлумачыць меры першай дапамогі атручаным газамі.

ПЕРАМОГА КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ НА ВЫБАРАХ

ПАРЫЖ, 22 кастрычніка. (Інфармацыя «Правды»). Учора компартыя Францыі атрымала дзве бліскучыя выбарчыя перамогі, значэнне якіх далёка выходзіць за чыста мясцовыя рамкі. У часе перабалатыровкі кандыдата на пост дэпартаменцкага советніка другой акругі ў Іўры (у ваколіцах Парыжа) комуніст Рыго быў выбран 9.505 галасамі супроць 7.072 галасоў, атрыманых рэакцыйным кандыдатам.

Найбольш важны момант у гэтых выбарах заключаецца ў тым, што Рыго атрымаў не толькі ўсе галасы сацыялістаў і комуністаў, паданыя на першым туры, але і 500 новых галасоў, раней паданых за радыкалаў. Гэта значыць, што яшчэ 500 працоўных уключыліся ў адзіны фронт. Паведамленне аб выходзе выбараў выклікала сярод рабочых энтузіязм.

Учора адбыўся другі тур муніцыпальных выбараў у Женевіллье каля Парыжа. Спіс компартыі атрымаў 2.468 галасоў, рэакцыйны спіс—2.272 галасы.

* * *

Далейшым доказам крыталізацыі палітычных сіл у краіне з'яўляецца разлажэнне сярод «неа-сацыялістаў». Учора абдываліся выбары ў Пэнтральны совет гэтай «партыі». Яе заснавальнік і «правадыр» Марке—міністр грамадзкіх работ, якому было прапанавана выйсці з габінета, заявіў Пэнтральнаму совету аб тым, што выходзіць з партыі(!).

Марке прывозіць матывы выхаду ў вялікім пісьме, дзе гаворыцца, што ён стаяць інтарэсы бацькаўшчыны вышэй інтарэсаў партыі. Нацыянальны совет пасля ажыўленых спрэчак мог толькі прыняць да водама выхад Марке, што паводле слоў «Попюлер», роўнасільна «пахаванню» ўсёй партыі.

САКРЭТНЕ ЯПОНА-ГЕРМАНСКАЕ ГАНДЛЁВАЕ ПАГАДНЕННЕ

ЛОНДАН, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Паводле слоў «Дэйлі герольд», у Лондане атрымана інфармацыя аб тым, што паміж Германіяй і Японіяй нядаўна заключана сакрэтнае гандлёвае пагадненне.

Германія згадзілася на працягу доўгага часу набываць у Японіі штогод не менш мільёна тон совых бабоў, а Японія ў Германіі — выбуховыя матэрыі, кулямёты, авіяцыйныя маторы і хімічныя прэпараты. Абодва ўрады прадпрынялі крокі, каб пагадненне не стала здабыткам гласнасці.

Некалькі германскіх фірм атрымалі ўжо японскія заказы на аснове пагаднення. Газета дадае, што, апрача гандлёвага дагавора, паміж Германіяй і Японіяй дасягнута дагаворанасць аб пасылцы у будучым годзе 500 германскіх лётчыкаў і інжынераў у Японію.

ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ ТЭЛЬМАНА

ЛОНДАН, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Гэтымі днямі ў новым раскошным кіно «Павільён» у часе паказу фільма на экране нечакана з'явіўся, спатканы воплескамі надпіс: «Вызваліце Тэльмана ад фашысцкіх катаў, змагайцеся з фашызмам у Англіі. Стварайце адзіны фронт!».

Матросы германскага броненосца «Дэйчлянд», наведаўшы Лейт і Эдынбург, усюды на вуліцах маглі бачыць плакаты на нямецкай мове, якія заклікаюць да вызвалення Тэльмана і да барацьбы за совецкую Германію.

ПАД КРЫЛКАМ РОЗЕНБЕРГА

ПАРЫЖ, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). «Эксцельсіор» паведамляе рад новых дэталей, якія выкрываюць сувязі харвацкіх тэрарыстаў з германскімі нацыянал-сацыялістамі. Ва ўстанове, кіруемай Розенбергам, — піша газета, — ёсць спецыяльнае бюро, так званае «даследчае бюро», якое займаецца распальваннем усіх сепаратысцкіх рухаў у Еўропе. Праз нейкага Ковача Розенберг з 1932 года знаходзіўся ў сувязі з Першэнам (ён-жа Перыч), вядомым начальнікам лагера харвацкіх эмігрантаў у Янкапушта (Венгрыя) і бліжэйшым памочнікам Павеліча. Першэн — харват, былы афіцэр аўстра-венгерскай арміі і праславіўся сваім удзелам у дзейнасці германскай фашысцкай арганізацыі «Консул».

ЗАМАХ НА РУМЫНСКАГА КАРАЛЯ

ЛОНДАН, 22 кастрычніка. (Інфармацыя «Известий»). Газета «Івініг стандарт» паведамляе аб раскрыцці змовы ў Румыніі. Румынская паліцыя арыштавала двух чалавек, якія прабавалі ўзарваць чыгуначнае палатно, па якому павінен быў прайсці поезд румынскага караля Кароля.

ЗАЯВА ЮГАСЛАЎСКАГА ПРЭМ'ЕРА

ВЕНА, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Белграда, прэм'ер-міністр Узуновіч, які фармуе новы габінет Югаслаўскага ўрада, у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў: «у новы габінет увойдуць толькі асобы, якія безагаворачна прызнаюць сучасны палітычны курс Югаславіі. Прадпасылкай да гэтага з'яўляецца прызнанне манархічнай канстытуцыі дынастыі Кара-Георгіевічаў, дзяржаўнага і нацыянальнага адзінства існуючага дзяржаўнага парадку і непадзельнасці Югаславіі». У галіне знешняй палітыкі новы габінет, паводле слоў Узуновіча, будзе імкнуцца да захавання міру на Балканах.

ГОЛАД У ЯПОНСКАЙ ВЕСЦЫ

ТОКІО, 22 кастрычніка. (БЕЛТА). Паўночна-ўсходнія прэфектуры, якія церпяць на працягу апошніх 5 год ад неўраджаю, з прычыны новага неўраджаю ў гэтым годзе надвяргаюцца ўсім жахам голаду.

Недаяданне дзяцей, прадажа дзяўчат у публічныя дамы і самагубствы сталі масавай з'явай у гэтых прэфектурах. Паводле афіцыяльных даных, за 8 месяцаў бягучага года ў публічныя дамы і на фабрыкі ў якасці пастаянных работніц прадана 14 тыс. дзяўчат.

Будаўніцтва свінарніка ў калгасе «Комінтэрн», Барысаўскага раёна.

ЛІТАРАТУРНЫ АЛЬМАНАХ ПОЛЬСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выдае да Окцябрскіх свят літаратурны альманах польскіх пісьменнікаў БССР «Окцябр». У альманаху будзе змешчан рад апавяданняў, нарысаў і паэм польскіх совецкіх пісьменнікаў Кавальскага, Раманоўскай, Жарскага і іншых.

АБ ТЭРМІНАХ ВЫПЛАТЫ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ РАБОЧЫМ І СЛУЖАЧЫМ ДА ОКЦЯБРСКІХ СВЯТ

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦСПСБ

1. Абавязаць кіраўнікоў усіх прадпрыемстваў і ўстаноў выплаціць зарплату рабочым і служачым за кастрычнік месяц не пазней 1 лістапада.

2. Зарплата павінна быць выплачана рабочым і служачым пачасоўшчыкам у размеры іх тарыфнай стаўкі, а здзельшчыкам — з разліку не ніжэй іх здзельнай разліковай стаўкі. Поўны-ж разлік рабочым здзельшчыкам за работу ў кастрычніку павінен быць праведзен у тэрміны, агаворанымі ў колдагаворах, але не пазней 5 лістапада.

3. Банкам, пачынаючы з 26 кастрычніка пачаць бесперабойную выдачу сродкаў на зарплату, у першую чаргу прамысловым прадпрыемствам.

4. Адказнасць за своечасовую выплату зарплаты згодна гэтай пастановы ўскладаецца на кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў і на старшынь ФЗМК.

5. Горрайпрофсоветам і ўпаўнаважаным ЦСПСБ прасачыць за выкананнем гэтай пастановы.

Сакратар ЦСПСБ ГЕРАЎКЕР.
Член прэзідыума ЦСПСБ АДАМ.
23 кастрычніка 1934 г.

ПАЙКІ ДА ОКЦЯБРСКІХ СВЯТ

ЦСПСБ прыняў пастанову аб абслугоўванні рабочых святочнымі пайкамі. Героі пяцігодкі, ударнікі, рабочыя і іх дзеці павінны быць забяспечаны дадатковымі пайкамі звыш нармальнага па наступных мінімальных нормах. Героі пяцігодкі: мяса 1,5 кгр., рыбы — 2 кгр., масла 1 кгр., кандзітарскіх вырабаў 2 кгр., бульбяной мукі 1 кгр. Ударнікі: мяса 1 кгр., рыбы 1,5 кгр., кандзітарскіх вырабаў 1 кгр. Усе астатнія рабочыя: мяса 1 кгр., рыбы 800 гр., кандзітарскіх вырабаў 800 гр.



Узорна арганізавана супрапьпажарная ахова ў калгасе «Чырвоная ніва», Аршанскай МТС. НА ЗДЫМКУ: электрычная сірэна, устаноўленая на каньку страхі.

АГІТЗВЯНО САМАЛЁТАЎ ІМЯ ТРЭЦЯГА З'ЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

* Па выкліку калектыва «Звязды» работнікі «Чырвонай змены» ўносяць на пабудову агітзвяна самалётаў імя III з'езда рабселькораў 119 рублёў. Падпіска прадаўжаецца.

Выклікаем работнікаў рэдакцый газет «Піонер Беларусі», «Юнгер арбайтэр», «Юнгер ленінец» і журнал «Іскры Ільіча».

Старшыня МК выдавецтва «Ч. З.» ЛОСЕЎ.
Комсамольскі арганізатар ФЕЛЬДМАН.

* * *

* Выклік калектыва работнікаў рэдакцыі і друкарні лепельскай раёнгазеты «Калгасная праўда» прымаем.

На пабудову агітзвяна ўносім 70 руб. і выклікаем работнікаў рэдакцый і друкарань слуцкай газеты «Ленінскі шлях», чырвонаслабодскай «Калгаснік», любаньскай «Калгаснік Любаншчыны».

Калектыў работнікаў рэдакцыі і друкарні газеты «Калгаснік Старобіншчыны».

* * *

* На 20 кастрычніка ў Бешанковіцкім раёне сабрана на агітзвяно самалётаў імя трэцяга ўсебеларускага з'езда рабселькораў 140 руб.

РАЙГЗАЕТА.

* * *

* На алёцаселькораў калгасаў, зоны дзейнасці Мазырскай МТС сабрана 200 руб.

ФРАЛОЎ.

* * *

На пабудову агітзвяна самалётаў імя III з'езда рабселькораў перавядзена 350 рублёў. Задание выканалі. Збор сродкаў прадаўжаем.

«Большэвіцкі змагар» — ТУЧЭНКА.

Ельск.

* * *

Рэдакцыя газеты «Чырвоная Полаччына» сабрала 80 руб. і разгортвае работу сярод селькораў.

РЭДАКЦЫЯ «ЧЫРВОНАЙ ПОЛАЧЧЫНЫ».

* * *

Сродкі на пабудову агітзвяна трэба пералічваць у Беларускае аддзяленне Дзяржбанка на бягучы рахунак № 160/10006.

ШАХМАТНЫ ТУРНІР МАЙСТРАЎ САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІК

(Уражанні ўдзельніка).

Нядаўна закончыўшыся ў Тыфлісе турнір майстраў з'яўляецца буйнай падзеяй у шахматным жыцці СССР. У турніры прынялі ўдзел прадстаўнікі трох брацкіх рэспублік: ад Закаўказья 6, ад Украіны 3, ад Беларусі 2. Паза конкурсам — аўстрыйскі мэтра Кмох, Рагозін і Раўзер.

Калонная ала Соўпрофа Грузіі не змяшчала ўсіх жадаючых прысутнічаць на турніры. Спаборніцтвы праходзілі выключна напружана: ад ны змагаліся за нападанне ў чацверку, даваўшую права для ўдзелу ў розыгрышы першынства СССР, другія за атрыманне годнасці майстра, трэція — за пацвярджэнне годнасці майстра і ў канцы турніра некаторыя змагаліся за тое, каб уйсці ад апошняга месца.

Гэтым тлумачыцца пераважная большасць адкладзеных партый і параўнаўча высокі процант нічыіх.

Высокія месцы, занятыя ў турніры прадстаўнікамі Беларусі (дзядзёж 6 і 7 месца, калі выключыць граўшых па-за конкурсам Кмоха і Рагозіна, то дзядзёж чацвертага і пятага месца) гаворыць самі за сябе. Шахматны рух у БССР развіваецца надзвычай інтэнсіўна. Украіна пры трох прадстаўніках стала ніжэй Беларусі.

Чэмпіён Менска Верасаў набраў 6,5 ачка, што па ўмовах турніра дае годнасць майстра. Такім чынам, Беларусь мае ўжо двух майстраў.

Аўстрыйскі майстра Кмох, хоць і падзяліў 3, 4 і 5 месца, аднак трэба сказаць, што ён не паказаў сваёй перавагі над совецкімі майстрамі. Так, з 13 партый, ён выйграў толькі 3, прычым дзве з гэтых не былі заслужанымі.

Пераможца турніра майстра Голідзе ўзнагароджан каштоўным падарункам і яму-ж прыпадзе бясплатны абанемент у ложу тэатра імя Руставелі на ўвесь сезон.

Усе ўдзельнікі турніра і асобныя моманты спаборніцтва былі зазняты Дзяржкінпромам Грузіі.

Майстар В. І. СІЛІЧ.

ПАВЕДАМЛЕННІ

25 кастрычніка 1934 г. у 6 гадзін вечара Цэнтральнай выбарчай камісіяй пры прэзідыуме ЦВК БССР і ЦСПСБ склікаецца парада ўсіх трыкутнікаў наркаматаў, шэфбрыгад і сацнамеснікаў гор. Менска па пытанню: «Задачы работнага шэфства і сацнамеснічства ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў і ход падрыхтоўкі да VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў советаў».

Цэнтральная выбарчая камісія, ЦСПСБ.

* * *

Партклегія КПК па Беларускай ССР просіць з'явіцца ў партклегію КПК (Менск, памяшканне ЦК КП(б)Б, 2-гі паверх, пакой 34) або паведаміць свой адрас, месца работы і жыхарства тав. Нахуціна Хацкеля Альтэравіча (які раней знаходзіўся ў ленінградскай арганізацыі).

Просьба да ўсіх таварышоў і арганізацый, ведаючых месца пробывання т. Нахуціна Х. А. паведаміць ПК КПК.

Сакратар партклегіі КПК па Беларусі ЛЕЙЗЕР.

* * *

Партклегія КПК па Беларусі паведамляе, што партбілет № 2555408 на тав. Грамышкевіча Пятра Анікаславіча з'яўляецца несапраўдным.

* * *

26 кастрычніка ў 19 гадзін у Доме партактыва (пакой № 22) для таварышоў, якія выдучаны мевсіядзі прадпрыемствамі для правядзення гутарак да окцябрскіх свят, адбудзецца інструктаж на тэму: «Як партыя на чале з Леніным і Сталіным арганізоўвала і вяла Окцябрскім перавротам».

ДОМ ПАРТАКТЫВА ПРЫ МЕНГАРКОМЕ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

МЕНСК

МЕНСК У ЛІЧБАХ

Паводле апошніх даных, насельніцтва сталіцы БССР налічвае 188.808 чалавек. У 1912 годзе было 105.000 чалавек — рост на 79 проц. Окцябрская рэволюцыя ў корані змяніла сацыяльны твар жыхароў Менска, які стаў буйным прамысловым горадам, культурным цэнтрам Совецкай Беларусі. У 1912 годзе ў Менску налічвалася 1.930 прамысловых рабочых (1,8 проц. усяго насельніцтва), а ўжо ў 1933 годзе лік рабочых і служачых членаў прафсаюзаў узрос да 86.500, што складае адну трэцюю частку насельніцтва.

⊙ ⊙ ⊙

* Інтэрнат для студэнтаў зубнога тэхнікума на Камароўцы аканчан будаўніцтвам і здан у эксплаатацыю.

Мал. маст. МАЛКІНА.



Цэнтральная кацельная камароўскага раёна.

* Выязное пасяджэнне прэзідыума ЦК МОПР'а БССР адбылося гэтымі днямі на чырвонасядзкай швейнай фабрыцы «Окцябр». Абгаворвалася пытанне аб узмацненні прапагандысцкай работы сярод членаў МОПР'а. У лістападзе адбудзецца выязное пасяджэнне ЦК МОПР'а у адным з калгасаў Менскага раёна.

* Цыкл лекцый аб навінках саюзнай і сусветнай літаратуры наладжваецца ў бліжэйшы час у Доме пісьменніка. Першы вечар адбудзецца 5 лістапада. З дакладам аб кнізе Эрэнбурга «День второй» выступіць праф. Брэнштэйн. Даклад аб творы Аляксея Талстога «Петр первый» зробіць крытык тав. Кучар.

ПАСТАНОВА № 17

Прэз'дыума Менскага гарадскога совета ад 23 кастрычніка 1934 г.

АБ НЕПРАДСТАЎЛЕННІ СПІСАЎ ВЫБАРШЧЫКАЎ.

1. За непрадстаўленне спісаў выбаршчыкаў Менскай гарадской выбарчай камісіі АШТРАФАВАЦЬ:

Дырэктара фэбрыкі «Комунарка»—на 100 руб.;
Дырэктара муз чнага тэхні ума—на 100 руб.;
Загадчыка сталовай Дома пісьменнікаў —на 100 руб.

2. Папярэдзіць усіх кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, што ў выпадку дальнейшага непрадстаўлення спісаў выбаршчыкаў, яны будуць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

3. Прапанаваць кіраўніцтву ДС міліцыі спагнаць штраф з вышэйпазначаных асоб на працягу 3-х дзён.

Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менгорсовета ІПАТАЎ.

АДКРЫТ новы кацылярскіх прылад

МЕНБАЗА БЕЛГАНДЛЯ

ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО

па Совецкай вул.

(супроць ГУМ'а) у былым абутковым магазіне № 22.

АДКРЫТ МАГАЗІН КАНЦЫЛЯРСКІХ ПРЫЛАД

У продажы вялікі асартымент канцылярскіх прылад.

Магазін адкрыт з 10 раніцы да 7 вечара.

МЕНБАЗА БЕЛГАНДЛЯ.

Барысаўскі рускі педагагічны тэхнікум

АБ'ЯВЛЯЕ

асенні НАБОР студэнтаў на 1 курс

заочнага сектара

на 1934-35 навучальны год.

З ВОЧНЫ СЕКТАР РЫХТУЕ НАСТАЎНІКАЎ ДЛЯ РУСКІХ ШКОЛ.

Прымаюцца асобы, маючыя асвету не ніжэй сямігодкі, уладаючыя рускай мовай і працуючыя ў школах, не маючыя сярэдняй асветы.

Патрэбна прадставіць заяву з дакументамі: анкета, даведка аб соцстановішчы, метрыка і пасведчанне аб асвеце.

Тэрмін падачы заяў да 30 кастрычніка.

Асобы, паступаючыя на заочны сектар, трымаюць іспыты па рускай мове, на літаратыцы, гісторыі і грамадзяназнаўству.

Тэрмін навучання—3 гады. Заявы накіроўваць па адрасу: г. Барысаў, Подбельская, № 39, рускаму педтэхнікуму.

Нам. дырэктара тэхнікума ГАЧЧАРОЎ.

Рэдакцыі ЗВЯЗДЫ

ПАТРЭБЕН МАСТАК-РЭТУШОР.

Звяртацца ў мастацкі аддзел рэдакцыі.

Новы Мэблевы Магазін

МЭБЛЕВЫ МАГАЗІН

са Школьнай вул.

перамясціўся

ва ўноў адкрыты магазін

на Пляц Волі, дом № 4

(былы дом Горсовета)

У продажы вялікі асартымент тавараў: ложкі (нікеляваныя, вялікія і малыя), шафы новых фасон. ў, крэслы, сталы і т. д.

Магазін адкрыт з 10 раніцы да 10 вечара.

МЕБАЗА БЕЛГАНДЛЯ.

ЦЫРКАВОЕ ЭТЭАД ДЕ БЮРО

Наркомасветы БССР даводзіць да ведама ўсіх культаддзелаў саюзаў, загадчыкаў клубамі, фабзаўкомаў і інш. зацікаўленых арганізацый, што з 15 кастрычніка.

ЦЭБ'ам прымаюцца заяўкі

на мастацкае абслугоўванне артыстычнымі сіламі Окцябрскіх свят.

Для мастацкага абслугоўвання окцябрскіх свят спецыяльна запрашаюцца артысты вышэйшай кваліфікацыі як БССР, так і іншых рэспублік наступных жанраў: юмар, сатыра, скетчы, ансамблі, цырк, балет, інструменталісты і інш.

Прыём заявак штодзенна з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня ў памяшканні ЦЭБ, клуб Соўгандальслужачых (рог Энгельса і Комуністычнай, пакой № 8, тэл. 22-755).

ЦЭБ.

Нарсуд Суранскага раёна абвяшчае грамадзяніна ганьбаванне гр. ШПАКОВУ Р. П., згодна прыгавора суда ад 16-5—34 г. па арт. 196 КК.

НАРКОМУНГАНДАЛЬ РСФСР „ПОСЫЛГОСТОРГ"

Масква, Мясніцкая, 47-131.

„ПОСЫЛГОСТОРГ" высылае насылкамі па пошце і чыгунцы ў любы пункт Союза індывідуальным заказчікам, арганізацыям, і калектывам:

КАНЦТАВАРЫ.

Шклографы літо з 2 ма шкл.—150 р., рэактывы да іх арыгінал. на 3 мес.—110 р., рататар 1-1—85 р., рататар 1-2—80 р., васковка папяровая КУЖД—12 кап. за аркуш, васковка папяровая „СОЮЗ"—10 кап. за арк., фарба рататарная—5 р. кгр., валік да рататара—9 р., арыфмометры сіст. „ОДНЭР" з-да „ЗЕТ"—1000 р., арыфмометры сіст. „ТАЛЕС" з-да „КИРАВЯ"—1100 руб., арыфмометры сіст. „ФЕЛИКС"—365 руб.

УВАГА: Пры заказе на рататар і васковку неабходна прадставіць дазвол міліцыі.

Ёсць таксама вялікі выбар розных канцтавараў па ўсей намінклятуры.

№ 8. Стандартная пасылка з 35 прадметаў—паперы пісьмовая, капіравальная, бюмажная, запісныя кнігі, блакноты, службовыя запісні, алоўкі розныя, пер'і, лічыльнікі канторскія і інш. тавары . . . 100 р.
№ 9. Стандартная пасылка ў поўразмера 30 прадметаў . . . 50 р.
№ 10. Вучнёўская пасылка 1-й ступені—сшыткі, алоўкі, пер'і і інш. . . . 10 р.
№ 11. Вучнёўская пасылка 2 ст.—гатавальня, сшыткі, пер'і, алоўкі і інш. неабходныя вуч. ўсякія прылады . . . . . 20 р.
№ 12. Чарцёжная пасылка—гатавальня з 12 прадметаў, лагарыфмічная лінейка, пеналы, вугольнік, сшыткі, алоўкі . . . . . 60 р.

ФОТА-ТАВАРЫ:

№ 13. Фота-апарат „АРФО". Размер 9Х12, анастыгмат. Адзінарнае расцяжэнне. Светасіла 1:6,3 з трыма касетамі і спускам . . . 202 р. 40 к.
№ 14. Тое-ж апарат з аб'ектарам матарыляў і трыма касетамі да яго . . . 300 р. —
№ 15. Фота-апарат „АРФО", размер 9Х12, анастыгмат, расцяжэнне тыпу тэсар. Светасіла 1:4,5—155 мм з футлярам, трыма касетамі і спускам . . . . . 307 р. 30 к.
№ 16. Апарат „АРФО" 9Х12. Анастыгмат. Падвойнае расцяжэнне тыпу тэсар, светасіла 1:4,5 з футлярам і з аб'ектарам матарыляў і прылад . . . . . 400 руб.
№ 17. Фота-апарат перыскоп размер 6 з пал. Х9 з трыма касетамі . . . 93 р. 04 к.
№ 18. Тое-ж з аб'ектарам матарыялу і прылад . . . . . 60 руб.

З надпісаннем указаных №№ стандартных пасылак старыя №№ пасылак па групе канцтавараў і фота аналогічна.

У ліку ўказаных цэн улічан кошт упакоўкі і перасылкі.

Заказы з'арганізаўшы выкнов ю ці на атрымання 50 проц. кошту заказанага тавара, з інш. індывідуальных заказчыкаў—пе атрыманні ўсяго кошту.

Заказы і грошы шліце па адрасу: МОСКВА, Мясніцкая, 47-131, ПОСЫЛГОСТОРГУ. Наш гарадзкі рахунак у Маск. абл. канторы Дзяржбанка № 6757.

Патрабуйце нашы каталогі па спорту, санітарыі і гігіене, гаспадарчых і бытавых прадметах і галантарыі, музыкальных інструментах і наглядных дапаможніках. Каталогі высылаюцца па атрыманні 20 кап. паштовымі маркамі.

„ПОСЫЛГОСТОРГ".

У ноч з 2 на 3 лістапада з 1-й да 3-х гадз. ночы

Народны камісарыят асветы, ЦП саюза працасветы і ЦК ЛКСМБ праводзяць

УСЕБЕЛАРУСКУЮ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКУ

ПА ПЫТАННЮ ўключэння культасветных установ у выторчы паход імя XI усебеларускага і VII усесаюзнага з'ездаў Советаў і п дзыхтоўкі да святкавання XVII гадавіны Окцябрскай рэволюцыі

Ля мікрафона—загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б т. КОНІК, народны камісар асветы БССР тав. ЧАРНУШЭВІЧ, старшыня ЦП саюза працасветы тав. ГРЫЦКЕВІЧ і сакратар ЦК ЛКСМБ тав. АУГУСТЭЙЦІС.

Ёсць усіх вяг. ана, старшынь РК саюза працасветы і сакратароў РК ЛКСМБ и. рэдакцыі-перакліку абавязкова.

Прапануецца арганізаваць слуханне асветніцкім і комсамольскім актывам.

НАРКОМАСВЕТЫ БССР,
ЦП САЮЗА ПРАЦАСВЕТЫ,
ЦК ЛКСМБ.

26-га кастрычніка ў 7 гадзін вечара, у Доме партактыва (рог вул. Энгельса і Карла Маркса),

склікаецца

НАРАДА ПРОФАКТЫВА гор. МЕНСКА

ПАРАДАК ДНЯ:

Аб удзеле профактыва ў рабоце бюро скаргаў Камісіі Совецкага Кантроля (дакладчык—ч. к. а. упаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР—тав. КАМЕНЕЎ М. М.).

На нараду павінны з'явіцца: старшыні ФЗМК, старшыні раённых камісій, цехпрофарганізатары, члены дэпутацкіх груп горсовета, рабочыя кантролёры, гранадскія кантролёры, бюро скаргаў, рабкоры газеты «Рабочий», вынаходнікі-рацыяналізатары.

Рэгістрацыя пачнецца ў 5 з пало. гадз.

ЦЭНТРАЛЬНЫ СОВЕТ ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ „РАБОЧИЙ".
БЮРО СКАРГАЎ УПРУНАВ. КСК па БССР.

ГУКАВЫ кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Мастацкі фільм ПЫШКА

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый" — Мастацкі фільм ГЮЛЛІ. Канцэрт Усходн. ансамбля

Кіно „Інтэрнацыянал" — НОВАЯ ПРАГРАМА

Кіно СПАРТАК — БЗЛА па раману Лермантава драма ў 8 частках

ГУКАВЫ кіно-тэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ" Сёння, 24 кастрычніка ДЗЕННЫ ДАДАТКОВЫ СЕАНС

Пачатак у 2 гадзіны дня. КАНЦЭРТ УСХОДНЯГА АНСАМБЛЯ МУЗЫКА, ТАНЦЫ.

На экране мастацкі фільм МЕКСІКАНСКІЯ ДЫПЛАМАТЫ сатыра ў 6 частках.

Дзеці на дзённы сеанс дапускаюцца.

Каса з 12 гадзін дня.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

25 кастрычніка—

ПЕРШАЯ ГАСТРОЛЬ

Отто ФРАНКАРДЗІ

ПАЧАТАК СЕАНСАЎ у 5-45, 7-30, 9-15 і 11 г.

Замежны АТРАКЦЫЁН ТРАНСФАРМАЦЫЯ.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — ПЕДЗІКАЎ, ст. друкар — АНУЧЫН. Уп. Галоўлітбела № К—3277.